Леанід Лаўрэш

# Фарны касцёл у Лідзе



Леанід Лаўрэш

# Фарны касцёл у Лідзе

Издательские решения
По лицензии Ridero
2026

УДК 82-3
ББК 84
Л25

Шрифты предоставлены компанией «ПараТайп»

**Лаўрэш Леанід**

Л25 Фарны касцёл у Лідзе / Леанід Лаўрэш. — [б. м.] : Издательские решения, 2026. — 76 с.
ISBN 978-5-0069-3035-3

Кароткая гісторыя рыма-каталіцкага веравызнання ў горадзе Ліда (Беларусь) і фарнага касцёла. Асобы, падзеі, архітэктура, мастацтва.

**УДК 82-3**
**ББК 84**

12+ В соответствии с ФЗ от 29.12.2010 №436-ФЗ

ISBN 978-5-0069-3035-3
© Леанід Лаўрэш, 2026

pawet.net

# Пачаткі

Гісторыя Ліды сягае ў глыб стагоддзяў, але дата заснавання горада да апошняга часу выклікала спрэчкі ў даследчыкаў, якія падавалі супярэчлівыя звесткі пра час узнікнення Ліды: ад 1180 да 1380 г. Аднак сёння можна з адноснай упэўненасцю казаць пра існаванне паселішча на тэрыторыі Ліды ўжо ў XII ст., рэшткі якога былі знойдзены ў 1930-х гг. Цікавым і важным для нас з'яўляецца тое, што паселішча гэта было славянскім, а не балцкім, як пра тое пісаў Тэадор Нарбут, пры тым, што датыроўка археолагаў адносна добра супадае з датай заснавання нашага горада, якую Нарбут дае як 1180 г.

На працягу 1323—1328 г. Гедымін пабудаваў каля паселішча Ліда, заснаванага паміж X-XII ст., магутны мураваны замак з байніцамі і чатырохпавярховай вежай. З 30-х г. XIV ст. Ліда пачынае фігураваць у кантэксце розных падзей, на старонках летапісаў і хронік Вялікага Княства Літоўскага і горад упершыню згадваецца ў адзін год са сталіцай дзяржавы Вільняй. Верагодна, большасцю насельнікаў Ліды былі язычнікі.

Каля магутнага замка рос горад, і ў ім паступова распаўсюджвалася хрысціянства. У першай палове XIV ст. горад, у першую чаргу дзякуючы замку, з'яўляўся адным з рэгіянальных ваенна-адміністрацыйных цэнтраў ВКЛ. Ліда стала цэнтрам намесніцтва, вядомага з 1382 г., а потым і павета ў складзе Віленскага ваяводства. Пасля Крэўскай уніі 1385 г. Ліда аказалася важным, бліжэйшым да Вільні населеным пунктам, каля якога ляжаў шлях ад сталіцы ВКЛ да польскай сталіцы Кракава. Такое геаграфічнае размяшчэнне Ліды, разам з наяўнасцю добра ўмацаванага і да таго ж досыць камфартабельнага замкавага комплексу еўрапейскага тыпу, зрабіла горад месцам прыпынку Ягай-

лы ў яго частых паездках. Тут адбываліся важныя для абедзвюх дзяржаў сустрэчы, перамовы, урачыстасці. Усё гэта вабіла ў Ліду і хрысціянскіх місіянераў з захаду.

Пачатак каталіцтва ў Лідзе адносіцца да часоў княжання Альгерда. Адзін з літоўскіх вяльможаў, Гаштольд, прыняў рыма-каталіцкую веру, узяў пад сваё заступніцтва манахаў ордэна св. Францішка і пабудаваў для іх манастыр ў Вільні. У 1366 г. тры францішканы прыбылі ў ВКЛ з Польшчы, каб распаўсюджваць тут хрысціянскую веру і пасяліліся ў Лідзе. Праз тры гады місіянераў забілі паганцы. Але ў Ліду прыйшлі новыя браты-францішканы. Над магілай сваіх папярэднікаў яны пабудавалі капліцу, пры якой і пасяліліся. Лідскім старастам тады быў хрысціянін Даўгерд. У 1376 г. колькасць місіянераў павялічылася да 9 манахаў. Крыніцы паведамлялі, што яны прывезлі з сабой з Візны абраз Маці Божай. Але вядома, што ў Візне ніколі не было францішканаў, а ў той час не было нават касцёла і каталіцкая парафія там з'явілася толькі ў 1390 г.

Новы этап хрысціянскай гісторыі Лідчыны пачынаецца з заключэння ў 1385 г. Крэўскай уніі. Ёсць звесткі, што ў горадзе адбылася выдача дзяржаўных грамат, звязаных з хрышчэннем Літвы. У 1387 г. была створана Віленская рымска-каталіцкая епархія. Ва ўласнасць епархіі вялікі князь перадаў воласць Дуброўня каля Ліды.

У 1387 г. Ягайла заклаў у Лідзе адзін з першых касцёлаў у ВКЛ. Ён перадаў яму вёску, якая зараз называецца Плябанцы, і даход з нейкай іншай воласці. Так сама Ягайла надаў зямлю «на 6 сох», 3 пляцы, лугі і корчмы, дзесяціну з усёй каралеўскай маёмасці ў Лідскім павеце і 6 рублёў. Гэты фундуш быў пацверджаны 7 ліпеня 1616 г. каралём Жыгімонтам III. Касцёл знаходзіўся на падзамчы і згарэў у 1392 г. пры нападзе крыжакоў. У 1397 г. быў пабудаваны новы касцёл. Яго асвяціў віленскі біскуп Андрэй, які зноў адкрыў пры касцёле францішканскую місію, бо ранейшыя місіянеры гэтага ордэна былі хутчэй за ўсё

забітыя або выгнаныя падчас нападу крыжакоў на Ліду ў 1394 г.[1]

І гэты касцёл згарэў у 1406 г. У 1414 г. ён быў узноўлены як парафіяльны і высвечаны пад назвай «Найсвяцейшай Дзевы Марыі Панны, Усіх Святых».

Фрагмент прывілею касцёлу, дадзены Ягайлам, бярог сярод іншых дакументаў Лідскі пробашч. У дадатку да пятага тома «Старажытнай гісторыі літоўскага народа» Т. Нарбут змясціў тэкст гэтага прывілею, а таксама спіс пробашчаў Лідскага касцёла, які прыводзіцца ў дадатках[2].

У Метрыцы ВКЛ Лідскі касцёл згадваецца ў 1516 г. з-за

---

[1] «Віленскі біскуп Андрэй з волі караля Уладзіслава Ягайлы і князя Вітаўта *eryguje* кляштар меншых братоў (францішканаў) у Лідзе і konsekruje ім касцёл пад вызваннем св. Крыжа і св. Францішка». — цыт. па: Kodeks dyplomatyczy. Krakow, 1932. T. 1, z. 1, S. 51.

[2] Narbutt T. Cokolwiek z historyi miasta Lidy // Narbutt T. Dzieje starozytne narodu litewskiego. T. 5. Wilno, 1839. Dodatek I. S. 1. (In nomine Dni Amen. Vladislaus dei gratie Rex polonie lituanieque Princeps supremus e. t. c. Heres mie e. t. c. Ad perpctuam rei memoriam. Quamquam ex suscepli cura Regiminis universorum nostrorum Regimini subditorum utilitale tenemur ad ea tanien que diuini cultui administracionem decus ac gloriam ac statum felicem et quietem, ac virium firmitatem Ministrorum Omnipotentis conspiciunt, tanio dignius intendimus quantum pro ceteris mundi Principibus nomen Regale solum magniricencie extollit et mirabilius universorum prouidencie creatoris consideranles sane Omnipotenlis inimensam clemenciam qua nos ovem pridem perditam ad Begales dignitates solium Clementissimi sublimauit, volentesque tanquam fidelis commissorum gubernator pro infinibis heneficiis aliquibus licet tamen exilio meritis obuiare. Ecclesiam vetere nostre fundacionis olim pp. cc. ord. s. Francisci Apostolis Lituanie cominendandam in opido nostro Lida nunc de nouo conslructam et ad honorem Omnipotentis Dei Gloriosissime Virginis Marie Omnium Sanctorum specialiler Sancti Crucis… dicalum……dotauirnus bonis prouenlibus et utilitatibus ut in nostris literis ……..clare nitilur confirmamus et incorporamus donamus et appropriamus Lidensem……….Dougirdi…… ..ommos thelonis vulgariter. На абаротным баку стаяла дата дадания по-

таго, што намеснік Лідскага дзяржаўцы Юрыя Ільініча не аддаў арыштаванага слугу гетмана Канстанціна Астрожскага, калі *«тотъ нятецъ самъ прибегъ на цвинтаръ и въ костелъ Лидски на кони звязанъ, и ноги подъ конь окованы»*.

Пад час спусташальнай вайны 1654—1663 гг. горад быў цалкам знішчаны, і таму пасля вайны быў пабудаваны новы, па маіх падліках, ужо 4-ты ці 5-ты касцёл (бо не вядома, ці прастаяў касцёл 1414 г. 240 гадоў, ці да 1654 г. у горадзе быў пабудаваны ўжо наступны, таксама драўляны касцёл).

Цікавай з'яўляецца інфармацыя Тэадора Нарбута, пра тое, што ксёндз Міхаіл Зянкевіч, які быў лідскім пробашчам у 1747 г., а потым стаў віленскім біскупам, перанёс касцёл *«на іншае месца з падзамча, дзе зараз пляц перад Домам Скарбовай касы»*. Тэадор Нарбут, верагодна, ведаў і размаўляў з асобамі, якія сваімі вачамі бачылі той стары драўляны касцёл, і таму няма прычын сумнявацца ў гэтай інфармацыі. Растлумачу, што месца на якім стаяў гэты касцёл, знаходзіцца каля сучаснага помніка Гедыміну. Зразумела, што да моманту пабудовы мураванага фарнага касцёла, які стаіць і сёння, ужо больш за 300 гадоў на гэтым пляцы вакол яго існавалі могілкі, аднак. Аднак вядома, што падчас шматлікіх земляных работ на поўнач ад замка, дзе зараз стаіць помнік Гедыміну, не знаходзіліся чалавечыя парэшткі. Адзінае тлумачэнне гэтай загадкі — касцельны пляц з другой паловы XVII ст. быў вельмі вялікі і нейкі час уключаў ў сабе падзамча разам з сучасным касцельным пляцам (на якім шмат чалавечых парэшткаў), але пахаванні нябожчыкаў заўсёды рабіліся прыкладна на тэрыторыі сучаснага

---

тым: A. Domini M. CCC. XIIII. Feria iijj. in hebd. Pentecost... У імя Бога, аман. Уладзіслаў Кароль Божай міласцю Польшчы, вялікі князь Літоўскі... і г.д... На вечную памяць... Касцёл нашай старой фундацыі ордэна Святога Францішка, Апостала Літвы, заснаваны раней у нашым горадзе Ліда, зараз нанава збудаваны і названы ў гонар Усіх Святых, асабліва Святога Крыжа, мы надзяляем маёмасцю і прывілеямі...).

пляца фарнага касцёла. Гэта значыць, што ўсе першыя драўляныя касцёлы стаялі недзе недалёка ад сучаснага фарнага касцёла і толькі драўляны касцёл, пабудаваны каля 1670 г., стаяў на падзамчы.

Як раз пра гэта і можа сведчыць кавалак тэксту (верагодна ад 1670 г.) лідскага Магдэбургскага прывілею:

> *«... касцёл Лідскі ад найяснейшых папярэднікаў нашых быў фундаваны і нададзены, але ніякага пляца для шпіталя не мае, але нашы лідскія гараджане маюць месца недалёка ад касцёла на падзамкавым рынку, на якім можа быць пабудаваны шпіталь»*[1].

Як бачым, пабудаваны тут на падзамчы быў не толькі шпіталь, але і касцёл.

У тэксце візітацыі касцёлаў Віленскай дыяцэзіі ў 1674 г. біскупам-суфраганам Мікалаем Слупскім, пра Лідскі касцёл зроблены наступны запіс:

> *«Касцёл новазбудаваны, драўляны, пабудаваны коштам мясцовага дэкана, ксяндза Ігната Рэберта, асвечаны пад час знаходжання візітатара».*

З дрэва гэтага касцёла потым была пабудавана ўніяцкая царква Уваскрасення Гасподняга на Зарэччы.

Рэктар лідскіх піяраў у першай палове XIX ст. кс. Язафат Вайшвіла пісаў:

> *«Стары фарны драўляны касцёл... стаяў каля замка на пачатку галоўнай вуліцы. Тыя, хто сваімі вачамі бачыў стары драўляны касцёл, казалі, што ён падобны на сучасны і таксама быў павернуты да галоўнай вуліцы».*

Адсюль даведваемся, што стары, драўляны лідскі касцёл быў пабудаваны ў стылі барока, меў дзве вежы і стаяў з боку замка. Каштоўная інфармацыя.

---

[1] Шпіталь пры касцёле ці царкве ў той час выконваў ролю дома састарэлых, якія не мелі сваякоў і жылі ў ім на сродкі парафіі.

Пры касцёле меліся капліцы: у Чэхаўцах, Перапечыцы, на гарадскіх могілках (св. Барбары, пабудавана ў 1805 г.,), у Востраве (на свае сродкі фундаваў Тадэвуш Нарбут, ліквідавана ў 1866 г.) і філіяльны касцёл у Кір'янаўцах (фундаваны ў 1602 г. Марцінам Курчам, ліквідаваны ў 1866 г.).

Як філіяльны, у 1460 г. Ганнай Давойнай быў фундаваны касцёл у Крупаве:

> *«Крупа, 25 мая 1460. Анна, удава па Івашку Давойнавічу з выразнай волі мужа, надае касцёлу Найсвяцейшая Панны Марыі ў Крупе частку вёскі Ястрэмблі ў Пінскім павеце, якая належала яе мужу, па згодзе яго брата Алехны Давойнавіча і сваіх дачок Хелены і Юльяны і міма супраціву ўпартага сына Пятра. Запісвае плябаніі касцёла сажалку з млынам, і луг у вёсцы Альхова, і два камяні воску ў вёсцы Саганевічы для святла каля магілы свайго мужа».*

На дакуменце маецца надпіс, зроблены 2 жніўня 1636 г. пробашчам лідскім кс. Адамам Ліпніцкім, які ад імя віленскага кс.- біскупа дадаў гэты фундуш да актаў касцёла.

Узгадаю тут вядомых мне біскупаў, якія нарадзіліся ці служылі ксяндзамі на Лідчыне.

Першы вядомы мне біскуп з Лідчыны — гэта луцкі біскуп Вацлаў з роду Клаўсуцяў. Ён быў братам Міхны і Юндзілы, вядомы нам таксама як віленскі дэкан, якога 10 верасня 1459 г. папа Пій II высвяціў у луцкія біскупы. Пасаду біскупа займаў да сваёй смерці, толькі тры гады. Разам з братамі быў адным з фундатараў касцёла ў Ваверцы. У 1444 г. нейкі *Venceslaus de Wawerka Lithwanus* аплаціў вучобу ў Кракаўскім універсітэце і ў 1451 г. атрымаў ступень бакалаўра. Верагодна, гэта і быў будучы луцкі біскуп. Вацлаў быў сынам Якуба Рачкі Табутавіча, які валодаў значанай часткай радавых двароў Клаўсуцяў, а менавіта Дзітвой і Ваверкай на Лідчыне, а таксама Крамяніцай і Струбніцай на Ваўкавышчыне.

Пра другога біскупа піша Тэадор Нарбут, гэта лідскі пробашч з 1559 па 1580 г. Ян Андрэевіч, які займаў пасаду біскупа луцкага і берасцейскага.

Трэці біскуп, датычны Лідчыны — біскуп Міхал Зянкевіч, які стаў віленскім біскупам у 1747 г. Менавіта па яго ініцыятыве пачалося будаўніцтва сучаснага мураванага лідскага фарнага касцёла. Тэадор Нарбут паведамляў пра яго як пра лідскага пробашча ў 1747—1760 гг.

25 мая 2024 года ў катэдральнай базыліцы святога Францішка Ксаверыя ў Гародні адбылося біскупскае пасвячэнне біскупа-каад'ютара Гарадзенскай дыяцэзіі Уладзіміра Гуляя, які з 2003 па 2024 г. з'яўляўся пробашчам парафіі Узвышэння Святога Крыжа ў Лідзе.

19 ліпеня 2024 года, Яго Святасць Папа Францішак прызначыў ксяндза Андрэя Зноску, да гэтага часу пробашча парафіі Божай Міласэрнасці ў горадзе Лідзе Гарадзенскай дыяцэзіі, дапаможным біскупам Пінскай дыяцэзіі, надаючы яму тытулярны пасад Скардоны.

# Мураваны фарны касцёл

Фарны касцёл, фара (ад нямецкага *Pfarrei* — парафія, прыход) — назва, якую некалі давалі больш значным касцёлам. Найчасцей фараю зваўся самы стары касцёл горада альбо галоўны касцёл у дэканаце. У кафедральных гарадах фарным мог звацца другі па значнасці касцёл пасля кафедры. У наш час назву фарнага працягваюць па традыцыі насіць касцёлы, якія атрымалі яго ў мінулыя стагоддзі.




*Фарны касцёл на пачатку XX ст.*

У другой палове XVIII ст. у Лідзе, магчыма, па праекце віленскага архітэктара Глаўбіца, з цэглы ў стылі барока быў пабудаваны фарны касцёл Узвіжання Святога Крыжа, які дзейнічае да нашага часу.

Будаўніцтва новага, мураванага, касцёла пачалося ў 1765 г. і было скончана ў 1770 г. стараннямі Віленскага суфрагана (вікарнага біскупа) Тамаша Зянкевіча, які выканаў запавет свайго дзядзькі, біскупа Міхала Зянкевіча († 23.01.1762). Міхал Зянкевіч, перад тым, як у 1747 г. стаць Віленскім біскупам, быў Лідскім пробашчам. У сваім тастаманце, напісаным у 1761 г. ён рэкамендаваў прапанаваць прыцягнуць да будаўніцтва Іагана Крыштафа Глаўбіца або *«каго-небудзь яшчэ, добрага»*. Біскуп прызначыў для будаўніцтва 50000 тынфаў[1], і працэнты ад 7500 чырвоных злотых, якія былі размешчаны на фальварку Канюшаны. Тамаш Зянковіч хутка павялічыў гэтую суму на 4900 злотых. Касцёл пачалі будаваць недалёка ад старой святыні. Новы касцёл быў асвечаны ў 1768 ці 1780 г.



*Карта канца XVIII ст. Кляштар і касцёл кармелітаў, фарны касцёл, замак.*

[1] Агульны назва для манет бітых Андрэ Тынфам у 1663—1667 гг. Намінальны кошт: 1 зл. 30 грошаў, рэальны — каля 12—18 грошаў.

Аўтарства барочнага касцёла з'яўляецца спрэчным пытаннем. Імя Іагана Крыштафа Глаўбіца часта згадваецца ў якасці меркаванага архітэктара касцёла, не толькі ў навукова-папулярных даследаваннях, але таксама і ў навуковых артыкулах і энцыклапедыях. Імя гэтага найвыдатнейшага архітэктара віленскага барока згадваецца ў тастаманце біскупа Міхала Зянковіча ад 1761 г., у якім выканаўцам тастаманту рэкамендуецца пабудаваць новы касцёл у Лідзе.

Біскуп Зянковіч памёр 23 студзеня 1762 г., а будаўніцтва мураванага парафіяльнага касцёла ў Лідзе пачалося толькі ў 1765 г. Праз два гады, 30 сакавіка 1767 г., Глаўбіц памёр. У гэтым выпадку стылістычны аналіз формаў фарнага касцёла не можа быць эфектыўным інструментам, арыгінальнай засталася толькі канструкцыя прэзбітэрыя 1765—1770 гадоў, астатнія ж часткі — фасад і бакавыя фасады сталі вынікам перабудоў з апошніх гадоў XVIII ст. Першапачаткова фасад меў дзве трохпавярховыя вежы, ніжнія часткі якіх захаваліся да нашых дзён. Варта таксама адзначыць, што ўжо праз сем гадоў пасля яго завяршэння будаўніцтва касцёл знаходзіўся ў дрэнным стане, а дэфекты пагражалі сур'ёзным пашкоджаннем або нават абвальваннем скляпення з-за выкарыстання дрэнных матэрыялаў і несумленнай працы муляроў. Праўда, і дзве іншыя пабудовы Глаўбіца абваліліся (вежы віленскіх катэдры і ратушы), але гэта, хутчэй за ўсё, адбылося не з-за адсутнасці прафесіяналізму ці халатнасці. Глаўбіц ніколі не прысутнічаў на будаўніцтве касцёла ў Лідзе, але калі б ён зрабіў праект, дык, безумоўна, хаця б зрэдку кантраляваў ход будаўнічых работ, вядома, толькі да сваёй смерці ў 1767 г.

Варта таксама адзначыць, што біскуп Зянковіч у сваім тастаманце толькі рэкамендаваў наняць Глаўбіца, і гэта патрабаванне выканаўцы не былі абавязаны выконваць. Нягледзячы на тое, што сума, выдзеленая біскупам (50 000 тынфаў і 7 500 чырвоных злотых) была даволі значнай, магчымасці падрадчыкаў і ў першую чаргу віленскага

суфрагана Томаша Зянковіча, былі, безумоўна, далёкімі ад тых, якія меў Міхал Зянковіч. І таму шанцы наняць Глаўбіца былі малымі.



*План касцёла, 1947 г.*

Свой агульны выгляд касцёл захаваў да нашага часу, аднак вядома, што першапачаткова ён меў дзве трохузроўневыя вежы.

У візітацыі лідскага фарнага касцёла ўжо ў 1777 г. напісана:

> «На сваім месцы касцёл быў нядаўна пабудаваны пры дазволе ЯВ ягамосці кс.-біскупа віленскага Міхала Зянкевіча, намаганнямі і руплівасцю ЯВ ягамосці кс.-біскупа арыяпалітанскага Тамаша Зянкевіча, пад тытулам ранейшага касцёла, г. з. Адшукання св. Крыжа, закладзены ў 1765 г., завершаны ў 1770 г., са скляпеннем на чатырох слупах, увесь накрыты дахоўкай, прыходзіць

у заняпад з-за тонкіх балак, на якіх мацуюцца кроквы, а таксама з-за хваёвых тонкіх і часаных лагаў па ўсім даху касцёла, таму цячэ вада з-за няроўнасці памераў лагаў, дрэнна адлітая і пасаджаная дахоўка ў некаторых месцах абарваная ветрам, а жалабы паміж вежамі над хорамі, якія былі зроблены без бляхі, згнілі, з-за чаго тонкія бэлькі праз падцёкі вады таксама згнілі, на іх абапіраюцца 5 крокваў, і яны зрушыліся са сваіх месцаў, яны трымаюцца толькі на краі муроў і неўзабаве, калі не паклапаціцца, існуе небяспека абвальвання даху ўнутр касцёла на скляпенне, якое таксама моцна працякае і вада прасочваецца ў касцёл. Вежы ў гэтым касцёле трох'ярусныя цагляныя, пакрытыя бляхай, але месцамі вецер так выдраў бляху, што ёй няма на чым трымацца, таму не толькі атынкоўка карніза, але і сама сцяна пачынае завальвацца, а з фацыяты не толькі тынкоўка адвальваецца, але і яна ўся руйнуецца з-за нетрываласці муроў з-за працякання вады. На гэтых вежах два пазалочаныя крыжы, на фасадзе таксама адзін пазалочаны. Над вялікім алтаром узвышаецца вежачка з жалезным крыжам, пакрытая ліставым металам».

З-за памылак у праектаванні і будаўніцтве, а таксама з-за *«надта дрэннага матэрыялу»* ўжо ў 1777 г. касцёл патрабаваў рамонту, што запісана і ў візітацыі 1782 г. Першымі пачалі разбурацца трохузроўневыя вежы, з якіх зваліліся бляха, тынк і нават фрагменты гзымсаў і сцен; да таго ж ветрам павыбівала шыбы, і ўнутр пачала прасочвацца вада, што павялічыла небяспеку абрушэння вежаў. Рамонт праводзіўся ў 1782—1790 гг. пробашчам касцёла Казімірам Нарбутам, для чаго першапачаткова было выдзелена 16 000 тынфаў, а потым яшчэ 1675 чырвоных злотых. Цалкам касцёл быў адрамантаваны да 1792 г. Верагодна, тэхнічную экспертызу праводзілі архітэктары, прызначаныя біскупам Масальскім. У выніку рамонту былі разабраны дзве вежы, зроблены новы шчыт і, верагодна, цалкам перароблены фасад касцёла.



*Касцёл кармелітаў і фарны касцёл, пачатак XX ст.*

Па другой версіі, вежы канчаткова былі прыбраны пры рамонце 1826 г., але на акварэлі Юзафа Пешкі, намаляванай на пачатку XIX ст. вежаў на фарным касцёле ўжо няма. Таму, падобна, памыляўся рэктар Вайшвіла бо, верагодна, менавіта з яго падачы 1826 г. лічыцца годам разборкі вежаў, ён пісаў:

> «[Касцёл] раней меў дзве вежы, але яны былі зняты, бо пашкодзіліся пры пажары 1826 г. Вежы і ўвесь касцельны дах згарэлі, і новы дах быў зроблены стараннем пробашча Вінцэнта Лінкіна пры дапамозе парафіянаў. Скляпенне ў прэзбітэрыюме ці над вялікім алтаром было пафарбавана, што цалкам сказіла інтэр'ер. Толькі чатыры абразы пэндзля Смуглевіча здабыла гэтая святыня, а менавіта св. Яна Непамуцэна над дзвярыма сакрыстыі, св. Тадэвуша Апостала над дзвярыма скарбца, св. Барбары і св. Тэклі ў алтары».

Ніжэй, я яшчэ вярнуся да абразоў Смуглевіча.

На адлегласці 108 крокаў ад фарнага касцёла, далей на поўнач па вуліцы Віленскай (сучаснай Савецкай) стаялі былы кляштар і касцёл кармелітаў. Кляштар згарэў

у 1941 г. і быў разабраны на пачатку 1950-х гг. Пра касцёл, які праз сакрыстыю злучаўся з кляштарам, вядома, што ён меў форму крыжа даўжынёй 44,5 і шырынёй 17,5 локця, пакрыты дахоўкай. У 1908 г. касцёл быў разабраны, хоць касцельныя муры ўсё яшчэ стаялі да ўзроўню даху. Цэгла выкастоўвалася для будаўніцтва казармаў Паўночнага вайсковага гарадка.

З Бібліятэкі імя Асалінскіх (г. Уроцлаў) пры дапамозе майго сына, я атрымаў сканы рукапісу рэктара лідскай піярскай павятовай вучэльні Язафата Вайшвілы, напісаныя ў першай палове XIX ст. з малюнкам лідскага замка на першай вокладцы. Гэты малюнак, верагодна, намаляваў нехта з выкладчыкаў ці вучняў піярскай школы.




*Малюнак з вокладкі рукапісу Язафата Вайшвілы.*

Я не адразу звярнуў увагу, што справа ад замка (1) намаляваны касцёл з кляштарам кармелітаў (2) і, яшчэ трошкі правей — фарны касцёл з вежамі! (3) (гл. малюнак). Бачна, што кармеліцкі касцёл меў фасад, павернуты на ўсход і надбудаваны купал з сігнатуркай над вялікім алта-

ром. Трэба сказаць, што фарны касцёл для мастака знаходзіцца ў такой праекцыі, што дзве вежы бачны, як адна.

Але галоўнае — фарны касцёл намаляваны з трохузроўневымі вежамі. Гэты малюнак адзіны, на якім можна убачыць лідскія касцёлы ў іх першапачатковым выглядзе. Верагоднае датаванне малюнка з вокладкі — да 1790 г.

На гэтую выяву лідскага фарнага касцёла з дзвюма вежамі да апошняга часу не звярталі ўвагі, і ў кнізе «Шпацыры па старой Лідзе» (2020 г.) я нават напісаў, што такой выявы, верагодна, наогул не існуе. Таму аўтэнтычны малюнак з двухвежавым лідскім фарным касцёлам, касцёлам кармелітаў і замкам — важная, новая крыніца інфармацыі па гісторыі горада Ліды.

Рэктар кс. Вайшвіла паведамляў пра фарны касцёл:

> «Мураваны шпіталь (пры фарным касцёле) знаходзіўся ў самым рагу мура, які атачаў парафіяльны касцёл, з боку замка ад вуліцы Віленскай. Але ў пажары 1826 г. згарэў дах шпіталя і ўсё драўлянае, што ў ім было. Цэглу тады разабралі на падмуркі іншых дамоў, і таму цалкам знік нават след таго прытулку для ўбогіх.
> У другім рагу таго ж мура, пры той жа самай вуліцы Віленскай стаіць мураваны невялікі шпіталік, які мае толькі адзін пакой. У гэтым прытулку жывуць касцельныя і ўбогія дзяды на ўтрыманні багалюбівых парафіян. Невядома, калі гэты прытулак з'явіўся і хто яго будаваў».

Цікавай з'яўляецца інфармацыя рэктара піяраў пра тое, што ў першай палове XIX ст. у вёсцы Перапечыца, якая належала фарнаму касцёлу, працавала цагельня.

У новы касцёл былі перанесеныя некаторыя рэчы са старога: абразы, купель, увянчаная драўлянай статуяй св. Яна Хрысціцеля і арган, другі арган быў перанесены сюды з Крупаўскага касцёла.

Новы касцёл меў сем алтароў. Тры з іх (у тым ліку і галоўны) мураваныя, размалёваныя пад мармур, бочныя алтары — у блакітна-ружовыя тоны.

У галоўным алтары знаходзіўся абраз Маці Божай Ружанцовай. Пра Божыя ласкі, выказаныя праз гэты абраз, сведчылі запісы у «Кнізе цудаў». Таксама ў алтары былі чатыры драўняныя фігуры: злева св. Пётр і св. Станіслаў, справа св. Павел і св. Казімір, а над імі — чатыры стуковыя (штучны мармур) анёлкі.

Другія два мураваных алтары былі пад вызваннямі Яна Непамуцкага і Бічавання.

Алтар св. Яна Непамуцкага ў верхняй частцы меў маляваны на сцяне абраз Найсвяцейшай Панны Ружанцовай, алтар Бічавання там жа — абраз св. апостала Тамаша. Усе абразы ў бакавых алтарах, за выключэннем абраза Бічавання, былі новыя.

Два алтары, якія знаходзяцца пры ўнутрыкасцельных слупах мелі мураваныя прастолы з абразамі св. Антонія і св. Юзафа, якія былі перанесеныя са старога касцёла.

Іншыя два алтары пры бочных сценах пад вызваннем св. Барбары і св. Івона.

Сцены і столь прэзбітэрыюма[1] пакрывалі малюнкі. Падлога выкладзена каменнымі плітамі, але пад лаўкамі і па баках была выкладзена цэглай.

Унутранае абсталяванне касцёла з большага захавалася да нашых дзён.

Касцёл агароджвала мураваная сцяна, знутры якой знаходзіліся могілкі, каля касцёла стаяла званіца на чатырох слупах з двума званамі. На вуліцу вяла брама *«бляхай крытая, на ёй выраблене з жалеза імя Марыя з прамянямі зялёнага колеру»*. Адначасова з касцёлам планавалася пабу-

[1] Прэзбітэрый ці прэзбітэрыюм — («месца для выбраных», ад старагрэчаскага «сход святароў») частка каталіцкага храма між асноўным аб'ёмам і алтарнай апсідай, прызначаная для царкоўнага кліру.

дова плябаніі і двух шпіталяў, з якіх адзін ужо ў 1777 г. патрабаваў рамонту. У тым жа 1777 г. планавалася пабудаваць парафіяльную школу, бо шэсць вучняў да гэтага часу вучыліся ў доме арганіста.

З-за памылак пры праектаванні і будаўніцтве касцёла, а таксама з-за *«надта, дрэннага матэрыялу»*, ужо ў 1777 г. касцёл патрабаваў рамонту, пра тое ж самае напісана і ў візітацыі 1782 г. Першымі пачалі разбурацца трохузроўневыя вежы, з якіх звалілася бляха, тынк і нават фрагменты гзымсаў[1] і сцен, да таго ж ветрам павыбівала шыбы, і ўнутр пачала прасочвацца вада, што павялічыла небяспеку абрушэння вежаў.

З Вопісу парафій Лідскага дэканату 1784 г., даведваемся:

> «… ад касцёла ў кірунку на захад праз семдзесят крокаў знаходзіцца касцёл і кляштар кс. кармелітаў *antiqua observantia* (кармелітаў старых — Л.Л.), у кірунку на поўнач праз чатырыста пяцьдзесят крокаў знаходзіцца касцёл, кляштар і павятовая школа кс. піяраў, у кірунку на летні ўсход праз дзевяцьсот крокаў парафільная ўніяцкая царква *ritus graci uniti*, праз дзвесце пяцьдзесят крокаў у кірунку на зімовы ўсход стары мураваны замак, у кірунку паміж летнім захадам і поўначчу праз пяцьсот крокаў стаіць яўрэйская бажніца, у кірунку на поўнач праз дзве тысячы пяцьсот крокаў яўрэйскія могілкі».

У 1790 г. на грошы ксяндза Вінцэнта Нарбута быў устаноўлены новы арган, які змяніў арган, што застаўся яшчэ ад старога касцёла.

У 1791 г. касцёл пацярпеў ад расейскага войска.

Рамонт праводзіўся ў 1782–1790 гг. пробашчам касцёла Казімірам Нарбутам, для чаго першапачаткова было выдзелена 16 000 тынфаў, а потым яшчэ 1675 чырвонных злотых. Канчаткова касцёл быў адрамантаваны да 1792 г. Ве-

[1] Профільны пояс, карніз.

рагодна, тэхнічную экспертызу праводзілі архітэктары, прызначаныя біскупам Масальскім. У выніку рамонту былі разабраны дзве вежы, зроблены новы шчыт, верагодна, цалкам перароблены фасад касцёла. Таксама папраўленыя пілястры[1] і ўсе вокны. Дах нанава пакрыты гонтай, сігнатурка[2] над прэзбітэрыюмам пакрыта бляхай.

У 1794 г. значная частка касцельнага срэбра пайшла для падтрымкі паўстання, а касцёл быў яшчэ раз разрабаваны расейскім войскам.

Знакаміты віленскі гісторык, прафесар Іяхім Лелявель, у 1805 г. вандруючы праз Ліду, занатаваў:

> «Ліда — мураваны горад з драўлянымі сценамі[3]. Тут ёсць толькі мураваныя касцёлы, з іх піярскі касцёл ужо 6 гадоў як накрыўся дахам і белым пакрыццём[4]. Апрача гэтых двух з паловай касцёлаў[5] ёсць яшчэ замак з чатырма высокімі сценамі, які сведчаць што Ліда была горадам літоўскіх князёў і мела здольнасць да абароны. Па рагах замка стаяць разваленыя вежы, з трох бакоў замка цячэ рака Лідзея[6], а за замкам — драўляная пустая царква [уніяцкая царква Уваскрэсення Гасподняга — *Л. Л.*]».

15 жніўня 1812 г. у фарным касцёле і горадзе прайшлі святочныя мерапрыемствы па святкаванні дня нараджэння Напалеона:

> «[…] У 10 гадзін раніцы падпрэфект Лідскага павета Ігнацы Скіндар, акружаны абывацелямі і мясцовымі службоўцамі розных

[1] Пілястра — плоскі вертыкальны прамавугольны ў плане выступ на сцяне або слупе.

[2] Сігнатурка — невялікая вежачка (звычайна са звонам), якая звычайна ўзвышаецца над прэзбітэрыем.

[3] Гэта метафара Лялявеля кажа пра наяўнасць мураванага замка з касцёламі ў цалкам драўляным горадзе.

[4] Верагодна маецца на ўвазе белы тынк.

[5] Касцёлы: фарны, карmеліцкі і трэці, недабудаваны, піярскі — адсюль «два з паловай касцёлы».

[6] Насамрэч рэкі Лідзейка і Каменка.

ведамстваў, адправіўся з прэфектуры ў Фарны касцёл для прынясення самых гарачых малітваў Каралю Каралёў за цуд, створаны Яго творчай правіцай для нашай Радзімы.

Шматлікія дамы занялі ў касцёле пярэднія месцы, а натоўп простага народу напоўніў бакавыя прыдзелы. Па знаку, дадзеным гарматным стрэлам, у Касцёл увайшоў аддзел размешчанага ў горадзе 14 палка фузілераў і пашыхтаваўся пасярэдзіне касцёла ў два шэрагі. Прыгожы выгляд жаўнераў і іх пакорлівыя паводзіны перад алтаром Усявышняга расчулілі ўсіх прысутных, якія ўжо больш за дваццаць гадоў не бачылі свайго войска.

Пасярэдзіне храма быў усталяваны транспарант з вензелем Найусеміласцівага Імператара і Караля з подпісам пад вензелем: «Magne Cesar! Vive diu felix locuplexque omnium prosperitatum».

Пасля другога гарматнага стрэлу пачалася абедня, якую служыў, са шматлікім клірам, Станіслаў Нарбут, канонік Смаленскі і ён жа пробашч Косаўскі. Падчас набажэнства патрыятычную і адпаведную акалічнасцям прамову сказаў ксёндз Гаўлоўскі, прафесар мясцовай вучэльні піяраў.

Пасля дабраславення св. Дароў, пасля трэцяга гарматнага стрэлу, аддзел войска выйшаў з касцёла і пашыхтаваўся на могілках, дзе Вікенці Нарбут, канонік Інфлянцкі, пробашч і дэкан Лідскі, са шматлікім клірам праспявалі «Te Deum», пад бесперапынны салют з гармат і ручной агнястрэльнай зброі. Пасля Набажэнства ўсе прысутныя былі запрошаны на абед да падпрэфекта».

За першыя тры дзесяцігоддзі XIX ст. былі пабудаваны ўсе касцельныя пабудовы: шпіталь, могілкі, новая плябанія (1818 г.) і закончаны рамонты тынкоўкі, вокнаў, дзвярэй. У галоўным алтары ўстаноўлены абраз «Хрыстос, які падае пад крыжам».

У 1826 г. пажар знішчыў дах і вокны касцёла, згарэў таксама і шпіталь, страты былі вялікімі, бо яшчэ ў 1832 г. рамонт касцёла не быў закончаны. Пасля пажару, у 1828 г. дах касцёла пакрылі саломай.

На пачатку сакавіка 1832 г. у дадатак да павятовай у Лідзе была арганізавана і гарадская паліцыя, і ўжо 12 сакавіка 1832 г. выканавец абавязкаў Лідскага гараднічага падпалкоўнік Верашчак дзеля пакарання каталіцкага свя-

тарства за падтрымку паўстання, пачаў цяжбу з лідскімі касцёламі. З ніжэй прыведзеных дакументаў добра бачны фінансавы стан фарнага касцёла, упамінаюцца і расейскія вайсковыя рэквізіцыі. Лідскі гараднічы дакладваў Гарадзенскаму цывільнаму губернатару Мураўёву рапартам *«аб непрыстойных стане каталіцкіх цэркваў у г. Лідзе»*. Сярод іншага падпалкоўнік пісаў:

> «Настаяцелі тутэйшых манастыроў, маючы дастатковыя даходы на ўтрыманне малалікага духавенства, і хоць звыш гэтага, як я пацікавіўся, маюць яшчэ і ахвяраванні абывацеляў, складкі, … але дагэтуль каталіцкія цэрквы… без дахаў, агароджы і не атынкаваныя, таму 2 сакавіка я папярэдзіў настаяцеляў манастыроў, каб яны прынялі меры па прывядзенні ў належны выгляд… асмельваюся спытаць Ваша правасхадзіцельства, ці магу я ў выпадку ўхілення змусіць мерамі паліцэйскімі да выканання… прапановы».

Гарадзенскі губернатар 29 сакавіка піша ў Віленскую кансісторыю і выкладае ёй патрабаванні гараднічага. 12 красавіка губернатар атрымлівае адказ, што:

> «кансісторыя разам прадпісала Лідскаму дэкану ксяндзу Лінкіму абавязаць настаяцеляў тамтэйшых манастыроў да неадкладнага рамонту па меры магчымасці цэркваў, манастыроў і агароджаў, якія ім належаць, роўна, каб і фарны касцёл у ведамстве яго…, дэкана…, быў адрамантаваны …, і пра тое Вашаму правасхадзіцельству маю гонар паведаміць».

14 чэрвеня 1832 г. кіраўнік Віленскай епархіі біскуп Андрэй Клангевіч піша Мураўёву:

> «Лідскай царквы настаяцель святар Лінкім рапартам данёс епархіяльнаму ўпраўленню, што тамтэйшы гараднічы дасланаю другі раз позваю, настойліва патрабуе, каб ён Лінкім на працягу аднаго тыдня пачаў рамантаваць згарэўшую ад пажару фарную царкву, шпіталь, мураваную агароджу і пагражае змусіць яго да таго ваеннай экзекуцыяй… у разуменні чаго, … настаяцель Лінкім тлумачыць, што два гады таму назад ён атрымаў у кіраванне сваю Лідскую плябанію даведзеную да галечы, таму быў вымушаны даваць фундушовым сялянам дапамогу і… пабудаваць

званіцу, млын і цагельны завод, прыгатаваць патрэбныя для пакрыцця царквы матэрыялы. Але ў мінулым 1831 г. з нагоды былога бунту і будучы заняты задавальненнем ваенных рэквізіцый, не мог прывесці ў дзеянне... фабрыку, зімою ж па прычыне недахопу снегу і дрэннай дарогі меў вялікія перашкоды ў вывазе патрэбнага матэрыялу... настаяцель Лінкім абавязуецца выправіць мураваныя і драўляныя агароджы і плот перад вуліцай і пафарбаваць плябанскі дом, калі хутка будзе добрае надвор'е, а ў будучыні... заняцца рамонтам сваёй царквы».

Пасля скасавання ордэна піяраў у 1844 г. фарны касцёл прыняў ацалелы пры пажары піярскага кляштара звон.

У 1847 г. быў пабудаваны новы шпіталь для бедных, а ў 1856 г. адрамантаваны арганы.

У 1847 г. Ян Андрушкевіч ахвяраваў касцёлу абраз Божай Маці Вастрабрамскай напісаны вядомым жывапісцам Юзафам Азямблоўскім (1805–1878) на дубовай дошцы.

Ян Андрушкевіч не абмежаваўся гэтым абразом і ў 1853 г. ахвяраваў бронзавы пацыфікал[1] з кавалачкам дрэва Святога Крыжа, а ў 1877 г. падарыў невялікі абраз Маці Божай Чанстахоўскай. З мемуараў Януша Сегеня мы ведаем, што *«па правым баку вуліцы Віленскай* (сучасная Савецкая — *Л. Л.*) *... стаіць фарны касцёл, могілкі і фруктовы сад за ім пляцы і дамы п. Андрушкевіча...»*. Ян Андрушкевіч перад паўстаннем 1863 г. з'яўляўся бурмістрам горада. Вядомы лідскі мемуарыст Мірон-Браніслаў Нарбут паведамляў, што лідскі бургамістр — *«чалавек праўдзівы, энергічны і разважлівы»*.

---

[1] Пацыфікал — слова паходзіць з лацінскай мовы і азначае «чыніць супакой». Гэты літургічны прадмет прыйшоў на змену пацалунку супакою, што перадаваўся падчас св. Імшы духавенствам. Ён меў выгляд таблічкі з падстаўкай, якую давалі цалаваць вернікам. З XIII ст. пацыфікалы набылі форму шчыта, крыжа або манстранцыі (дараносіцы), і ў іх пачалі захоўваць рэліквіі. Як і раней, пацыфікал даюць вернікам для пацалунку ў асабліва ўрачыстыя моманты, а таксама выкарыстоўваюць у цырымоніі прывітання біскупаў.



*Радавод лідскіх Андрушкевічаў.*

У 1850 г. аконныя праёмы сакрыстый былі зачынены жалезнымі кратамі.

У 1851 г. на сродкі Канстанцыі Быстрыцкай каля касцёла пабудаваны новы цагляны шпіталь-прытулак з 4 пакояў з трыма печамі. У 1856 г. быў адрамантаваны арган аб 10 галасах, з 3-ма мяхамі. А ў 1861 г. Станіслаў Вольскі ахвяраваў фарнаму касцёлу распяцце Хрыста, выробленае віленскім разьбяром Зімабро.

З 1846 па 1866 г. пробашчам і дэканам лідскім быў Дыянісій (Дыянізі) Хлявінскі (1793–1870) — адзіны ксёндз філамат[1].

Вялікі рамонт усяго касцёла праводзіўся ў 1861 г. У 1878 г. адноўлены франтон святыні. Чарговы рамонт зроблены ў 1886–1892 гг.




*Каля фарнага касцёла, 1917 г.*

Расейскі афіцэр В. Любарскі, які перад паўстаннем у 1862 г. служыў у Лідзе, у сваіх мемуарах пісаў пра тры лідскія касцёлы:

> «У Лідзе, якая налічвала ў той час дзве з невялікім тысячы жыхароў, былі тры велічэзныя мураваныя касцёлы выдатнай архітэктуры, якія высока і ганарліва ўздымалі да неба свае прыгожыя шпіцы. Адзін з іх стаяў пусты, за непатрэбнасцю, бо вернікаў на ўсе касцёлы бракавала».

[1] Пра яго гл: Лаўрэш Леанід. Ксёндз Дзіянісій Хлявінскі, філамат // Навагрудчына ў гістарычна-культурнай спадчыне Еўропы (да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы). 2010. С. 172–175; Лаўрэш Леанід. Лідскі дэкан — філамат, ксёндз Дзіянісі Хлявінскі // Лідскі Летапісец. 2018. №3 (83). С. 7–10.

Пустымі стаялі два з трох: касцёл кляштара піяраў пасля пажару 1842 г. і касцёл кармеліцкага кляштара, зачынены пасля паўстання 1831 г. і перададзены спачатку ўніятам, а пасля ліквідацыі уніі, стаў праваслаўным.

Пасля Хлявінскага лідскімі дэканамі і пробашчамі фары былі Браніслаў Карповіч (1869–71), Каз’янін (1878), Шмігера (1879–82), Шумоўскі (з 25 мая 1882), Юзаф Сянкевіч (1894–1904). У 1906–1909 гг. пры пробашчы Юзафу Шкопу адноўлена тынкоўка, насценныя малюнкі, алтары.




*Фарны касцёл, плошча Славы, прыпынак аўтобусаў, 1930-я гг.*

У 1960-х гадах разабрана агароджа касцёла разам з брамай, што выклікала моцныя хваляванні сярод парафіян, але іхнія намаганні ўратаваць каштоўны гістарычны помнік у цэласці былі марнымі.

Дзякуючы рэстаўрацыі, праведзенай у канцы 1980-х — пачатку 1990-х гадоў, касцёл знаходзіцца ў добрым стане. Яго наваколле зведала значныя змены пасля зносу цагля-

най агароджы з познебарочнай брамай з вуліцы Віленскай (Савецкай) і будынка плябаніі, размешчанага ў паўночна-заходняй частцы вялікай касцельнай тэрыторыі.

* * *

Спынімся на сучасным стане твораў мастацтва ў фарным касцёле.

Алтары касцёла знаходзяцца ў добрым стане, хоць іхняя цяперашняя каляровая гама значна адрозніваецца ад арыгінальнай — блакітна-ружовай. Каваны амбон, на жаль, пафарбаваны алеем і зведаў іншыя радыкальныя змены. Тым не менш, ён і цагляныя алтары з'яўляюцца элементамі, якія даюць уяўленне пра ўнутранае ўбранне з 1770 г.



*Лідскі амбон у стылі ракако.*

Пасля Другой сусветнай вайны касцёл працягваў працаваць, дзякуючы чаму захаваліся прадметы мэблі, у тым ліку прадметы з іншых касцёлаў Ліды, такія як карціна

«Уцёкі ў Егіпет» і манстранцыя[1], падораная ў 1930 г. ад неіснуючай цяпер капліцы на вайсковых могілках, а таксама рэліквіі з былога кармеліцкага касцёла, сярод якіх, хутчэй за ўсё, ёсць некаторыя барочныя скульптуры і ажурныя рамы з разьбой. Аднак літургічнае начынне (зафіксаванае ў 1995 г.) не захавалася.

Асаблівай увагі ў лідскім фарным касцёле заслугоўвае прыгожы амбон у стылі ракако, які мае форму ажурнага каванага кошыка. Ён належыць да групы амбонаў, верагодна, выробленых адной і той жа, на жаль, дагэтуль ананімнай, майстэрняй для трох кармеліцкіх касцёлаў: святой Тэрэзы ў Вільні, у Магілёве, у Глыбокім (пасля скасавання ордэна, амбон перанесены ў мясцовы парафіяльны касцёл) і ў парафіяльным касцёле ў Варнянах (не захаваўся). Убранне касцёла святой Тэрэзы ў Вільні, у тым ліку і амбон, было створана паміж 1763 і 1765 гг. Такім чынам, здаецца, што гэтая віленская праца магла стаць узорам для серыі падобных амбонаў. Ананімная майстэрня, магчыма, паходзіла са сталіцы Вялікага Княства Літоўскага, і паспяховы першы праект у прэстыжным месцы (тут у капліцы, прылеглай да манастыра, знаходзіцца абраз Маці Божай Вострабрамскай) прывёў да серыі наступных заказаў.

Галоўны алтар у стылі позняга барока мае некаторыя агульныя рысы з галоўным алтаром у былым дамініканскім касцёле ў Сейнах (верагодна, з 1760-х гг.). Відавочныя падабенства таксама бачныя ў дызайне акулюса, аблямаванага ляпнымі аблокамі (круглай адтуліны ў сцяне, праз якую ўнутр пранікае святло).

Характэрным матывам познебарочных алтароў з'яўляецца афармленне капітэляў[2] акантавым арнаментам. У ві-

---

[1] Манстрацыя (дараносіца) — спецыяльны посуд для Святых Дароў, якую выкарыстоўваюць, каб здзейсніць Сакрамант саборавання цяжкахворым.

ленскай барочнай архітэктуры мы можам знайсці гэты матыў у Беразвеччы, у касцёле Святога Духа ў Вільні (калоны ў бакавых алтарах), у касцёле святой Тарэзы ў Вільні (калоны ў галоўным алтары), у былым дамініканскім касцёле ў Сейнах (калоны ў галоўным алтары). Такое шырокае распаўсюджванне (па-за межамі Віленшчыны гэты матыў выкарыстоўваўся, напрыклад, Янам дэ Вітэ ў дамініканскім касцёле ў Львове), гэта сведчыць пра тое, што такі матыў стаўся ўзорным — ён быў натхнёны дызайнам капітэляў Крысціяна Фрыдрыха Рудольфа (1692—1754, аўгсбургскі дызайнер алтароў і архітэктар) у кнізе выдадзенай у Аўгсбургу. Мы ведаем, што так званыя Аўгсбургскія ўзорныя кнігі мелі вялікі ўплыў на нашай тэрыторыі.

[2] Капітэль — верхняя частка вертыкальнай апоры (калоны ці слупа), якая ўспрымала гарызантальную нагрузку.



*Галоўны алтар фары.*

Скульптуры галоўнага алтара Лідскай фары даволі цікавыя, з характэрнымі вуглавата-ламанымі шатамі. Нягледзячы на стройныя прапорцыі, гэтыя фігуры нельга класіфікаваць як даволі рэдкі на Віленшчыне стыль ракако, які пачынаецца ў ляпной скульптуры пасля 1760 г. Ляпныя скульптуры ў бакавых алтарах, на жаль, з'яўляюцца толькі аддаленым водгукам арыгінальных, яны былі зроблены ў 1909 г. падчас рэканструкцыі, праведзенай віленскай майстэрняй Юзафа Сыпнеўскага і Францішка Гайкоўскага.

З першапачатковага ансамбля захаваліся дзве фігуры, якія калісьці ўпрыгожвалі галоўны алтар — святы Казімір і святая Зоф'я. Яны пералічаны ў інвентары ад 1882 г. Стылістычна гэтыя скульптуры не маюць нічога агульнага з тамтэйшымі фігурамі святых Пятра і Паўла.

Скульптура св. Станіслава, якая першапачаткова ўпрыгожвала галоўны алтар, з'яўлялася сапраўдным творам мастацтва і, хутчэй за ўсё, страчана назаўжды. Дзве фігуры анёлаў (невядомых святых?) на валютовых кансолях[1] — творы позняга барока першай паловы XVIII ст. Немагчыма сказаць, ці паходзяць яны з ранейшага драўлянага парафіяльнага касцёла, ці з лідскага касцёла кармелітаў. Да больш ранніх твораў, якія стылістычна належаць да ман’ерызму, можна аднесці фігуру святога Яна Евангеліста і галаву анёла. Асаблівую цікавасць выклікае адзенне святога Яна, мудрагеліста выразанае з дрэва. Зноў жа, нічога нельга сказаць пра паходжанне гэтых скульптур.

---

[1] Кансоль — выступ у сцяне ці ўмацаваная адным канцом у сцяне бэлька, яка падтрымлівала карніз, балкон, галерэю, фігуру, вазу ці інш. Валюта (завіток, спіраль) — пластычнае аздабленне ў выглядзе спіральнага завітка.



*Маці Божая Ружанцовая.*

Сярод абразоў, найстарэйшы — «Маці Божая Ружанцовая», якая сярод мясцовых вернікаў асацыюецца з цудатворным абразом, прывезеным у Ліду францысканцамі з Візнаў[1]. Як я ўжо пісаў вышэй, найважнейшым фактам

у кантэксце гісторыі цудатворнага абраза з'яўляецца тое, што ў Візнах ніколі не было францысканцаў, а ў 1366 г. там нават не было касцёла, а мелася толькі капліца. Прыход тут заснаваны толькі каля 1390 г.

Аднак, магчыма, францысканцы, накіроўваючыся ў тагачасную паганскую Літву, спыняліся ў Візнах, якія тады былі памежным горадам. Усё сведчыць пра тое, што гэта непацверджаная, аднак увесь час неўміручая гісторыя — толькі легенда, што пацвярджаецца і тым фактам, што інвентары XVII і XVIII ст. утрымліваюць супярэчлівыя звесткі, якія ідэнтыфікуюць сюжэт абраза як Дабравешчанне ці як Маці Божую Ружанцовую. А такі абраз мог быць створаны толькі пасля заснавання Ружанцовага брацтва, зацверджанага біскупам Яўстафіем Валовічам у 1627 г. Ніводзін з ранейшых абразоў лідскіх касцёлаў не захаваўся, і няма падстаў лічыць сучасны абраз Маці Божай Ружанцовай дакладным паўторам цудатворнага. Стылістычны аналіз дазваляе датаваць яго мяжой XVII — XVIII ст. Такім чынам, магчыма, што гэта той самы абраз, які знаходзіўся ў галоўным алтары старой драўлянай фары. Улічваючы, што пасля вайны 1655—1661 гг. фарны касцёл быў цалкам разбураны і яго давялося аднаўляць, амаль напэўна, што старыя касцельныя рэчы не захаваліся. Цудатворны абраз, калі ён існаваў і калі ён перажыў папярэднія разбурэнні, напрыклад, канца XIV і пачатку XV ст., верагодна, знік у XVII ст., а новы быў вольным спіскам папярэдняга. Магчыма таксама, што францішкане не прывезлі з сабой ніякіх абразоў і легенда была выклікана толькі драматычным лёсам пазабіваных першых францішканаў у Лідзе.

[1] Візна (польск.: Wizna) — вёска ў Польшчы, уваходзіць у склад Ламжынскага павета Падляскага ваяводства. Адміністрацыйны цэнтр гміны Візна. Знаходзіцца на беразе Нарава прыкладна за 21 км на ўсход ад горада Ломжа.



*Францішак Смуглевіч. Абраз святой Тэклі ў Лідскім фарным касцёле.*

Усе астатнія абразы ў касцёле — пазнейшыя. Найлепшым з іх з'яўляецца, да нядаўняга часу ананімны, а зараз вядома, што пэндзля Смуглевіча, абраз святой Тэклі першай чвэрці XIX ст., блізкі да віленскага класіцызму, стылю, у якім рэлігійныя тэмы сустракаюцца даволі рэдка.

Юзаф Азямблоўскі, больш вядомы як графік і літограф, у 1847 г. дадаў да сваёй творчай спадчыны алейную копію цудатворнага абраза Маці Божай Вострабрамскай. Сярод шматлікіх абразоў на Віленшчыне гэта адзін з самых старажытных, а каштоўнасць лідскай копіі павышаецца тым, што Азямблоўскі маляваў надзвычай рэдка, зараз вядома толькі некалькі такіх яго прац. Аднак майстэрня Азямблоўскага стварыла шмат літаграфічных святых выяваў, а сам Азямблоўскі ў 1840 г. стварыў літаграфію, якая была дакладнай копіяй гэтага цудатворнага абраза.

У наш час фарны касцёл замест ранейшых чатырох абразоў пэндзля Смуглевіча, пра якія пісаў рэктар Вайшвіла, мае толькі абраз св. Тэклі, і да гэтага часу лічыцца, што гэта абраз працы невядомага майстра пачатку XIX ст. Усе іншыя абразы Смуглевіча ўжо адсутнічаюць у інвентары касцёла 1882 г. Вядома, што ў драўлянай капліцы св. Барбары, пабудаванай у 1805 г., меўся абраз св. Барбары, які меў высокую мастацкую якасць. Куды ён падзеўся, невядома, бо ў сучаснай мураванай капліцы знаходзіцца толькі копія таго старога абраза.



*Маці Божая Вострабрамская ў Лідскай фары.*

Францішак Смуглевіч (Franciszek Smuglewicz, 06.10.1745, Варшава — 06 (18).09.1807, Вільня) — вядомы

мастак, заснавальнік беларускай і літоўскай нацыянальнай школ жывапісу. У 1763—1764 гг. вучыўся ў Рыме ў аўстрыйскага мастака Антоніа Марона, потым як стыпендыят караля Станіслава Аўгуста з 1765 г. вучыўся ў рымскай Акадэміі св. Лукі. У Рыме працаваў над інтэр'ерам касцёла Святога Станіслава з італьянскім мастаком і архітэктарам (потым прыдворным архітэктарам рускага імператара Паўла I) Вінчэнца Брэна. Падчас інвентарызацыі палаца Нерона ў Рыме капіраваў творы ранейшых майстроў. У 1784 г. вярнуўся ў Варшаву. У 1785 г., а потым з 1797 г. жыў і працаваў у Вільні, у 1786—1797 гг. зноў у Варшаве, дзе заснаваў прыватную школу жывапісу.

У Галоўнай віленскай школе (у 1803 г. ператворанай у імператарскі Віленскі ўніверсітэт), Смуглевіч заснаваў кафедру жывапісу і рысунку і кіраваў ёю. З 1797 г. атрымаў пасаду прафесара і запачаткаваў так званую віленскую школу жывапісу. Вучнямі Францішка Смуглевіча былі сярод іншых: Іосіф Аляшкевіч, Юзаф Пешка, Мацей Тапольскі і Матэвуш Такарскі.

У 1800—1801 гг. па запрашэнні імператара Паўла I жыў і працаваў у Санкт-Пецярбургу і, у прыватнасці, афармляў інтэр'еры Міхайлаўскага замка. Пахаваны на могілках Росы ў Вільні. Дакладнае месца яго пахавання было невядома ўжо пры канцы XIX ст.

Тое, што ў Лідскім фарным касцёле і зараз захоўваецца абраз пэндзля Францішка Смуглевіча, да апрацоўкі мной успамінаў кс. Вайшвілы было невядома, і гэта з'яўляецца вельмі важнай навіной.



*Святы Станіслаў уваскрашае Пятровіна.*

Сярод іншых абразоў варта адзначыць працы двух мастакоў: Мікульскага («Святы Казімір», 1853 г.) і Мірскага. Абраз Мірскага «Святы Станіслаў уваскрашае Пятровіна[1]», хоць і стылістычна створаны запозненна, бо ён вяртаецца

да перыяду класіцызму першай чвэрці XIX ст., але мае цалкам задавальняльную якасць.

Сучасныя арганы ў стылі неарэнесансу паходзяць з варшаўскай фірмы Адольфа А. Гомана і Станіслава Езерскага. Вызначыць год іх пабудовы даволі складана. Кароткія запісы аб дзейнасці гэтай фірмы даюць часам супярэчлівыя звесткі. Аднак Адольф А. Гоман кіраваў фірмай толькі каля 1923 года. Таму датаванне сучаснага аргана ў Лідзе можна вызначыць у межах 1908—1935 гг.

Неараманскія стацыі (крыжовыя шляхі) фарнага касцёла паходзяць з вядомай познанскай фірмы Юзафа Шпяткоўскага (якая таксама мела філіялы ў Варшаве і Вільні). Ідэнтычныя можна знайсці ў парафіяльных касцёлах Белагруды, Вялікай Бераставіцы, Старых Васілішах і Забалаці.

---

[1] Пятровін (Piotrowin) — герой польскай агіяграфічнай легенды, вядомай з «Жыцця Святога Станіслава», напісанага Вінцэнтам з Кельчы.



*Святы Казімір.*

Сярод літургічнага начыння два прадметы датуюцца XVIII ст. Рэліквіяр[1] Святога Крыжа, верагодна знаходзіўся ў папярэднім драўляным касцёле, які існаваў да 1765 г. Другі, манстрацыя ў стылі ракако, датуецца трэцяй чвэрцю XVIII ст. і магчыма таксама паходзіць з папярэдняга або зроблены спецыяльна для новага мураванага касцёла. Некалькі крыху пазнейшых, падпісаных прадметаў паходзяць з вядомых майстэрняў. Адным са старажытных вырабаў з'яўляецца гладкі келіх[2] у стылі барока-класіцызму, выраблены віленскім злотнікам Леапольдам Крупінскім каля 1820 г. Іншым творам віленскіх ювеліраў з'яўляецца неаракакавы рэліквіяр святога Францішка Асізскага з майстэрні Міхала Невядомскага. Таксама маюцца тры цікавыя прыклады неагатычнага ювелірнага мастацтва: пушка[3] першай чвэрці XX стагоддзя і келіх, які датуецца 1920-мі гг., выраблены ў вядомай варшаўскай фірме «Норблін, Вернер і С-кі» (фірма працавала ў 1864—1939 гг.), а таксама адносна новая рэч — пушка пачатку XX ст., вырабленая ў кракаўскай майстэрні Францішка Капачынскага, якая дзейнічала ў першай чвэрці XX-га стагоддзя. Яна была прывезена ў 1934 г. кракаўскімі піярамі, да якіх тады належала парафія ў Лідзе. Варшаўская ювелірная справа таксама прадстаўлена рэліквіярамі святога Казіміра, святога Урбана Пакутніка і святога Пакутніка, вырабленымі ў малавядомай майстэрні Аляксандра Яскульскага, якая дзейнічала каля 1900 года.

---

[1] Рекліквіяр — рэліквіярый, ёмкасць для захоўвання каштоўных рэліквій, якія маюць сакральнае значэнне.

[2] Келіх, тое ж што і пацір.

[3] Даразахавальніца.

# Старажытныя рыма-каталіцкія могілкі каля касцёла

Пад прэзбітэрыюмам фарнага касцёла, у яго скляпеннях былі падрыхтаваны месцы для пахаванняў больш заможных парафіянаў. Тэадора Манчунская — дачка нашага знакамітага гісторыка Тэадора Нарбута, згадвала цікавы эпізод з юнацтва свайго бацькі ў Лідзе:

> «Ліда запомнілася яму як наша павятовае мястэчка — [...] гэты горад займаў сваё месца ў гісторыі нашай сям'і, бо там стаіць касцёл фундацыі Нарбутаў[1]. Калі бацька быў малады, ён прыходзіў у госці да ксяндза-апата Нарбута[2]. Ксёндз любіў паразмаўляць, а людзі шмат казалі пра яго грошы [...]. Засталася ў маёй памяці гісторыя, якую бацька расказваў пра Ліду: „Пасля смерці ксяндза-апата, усе казалі, што ён недзе закапаў бочкі з золатам, і таму яго маладыя пляменнікі, між імі і я, шукалі бочкі па схованках“. Тэадор спыніўся на думцы, што скарб можа быць схаваны ў склепе пад касцёлам. Быў парушаны апошні прытулак памерлых, і адзін з нябожчыкаў, пругкі і лёгкі, скочыў Тэадору на грудзі. „У мяне перахапіла дух“, — казаў бацька, але потым, агледзеўшыся, ён зразумеў, што „высахшы, як трэска нябожчык, вельмі лёгкі і цвёрды, паўстаў перада мной, як струна, калі я наступіў на яго стапу“. Аказалася, што тутэйшае паветра і сухая зямля ўтрымлівае ўсе целы нябожчыкаў у падобным стане. Гэтым здарэннем закончыліся пошукі. Золата не знайшлі, ... але страху нацярпеліся. Дух апата вартаваў сваё золата і не жадаў, каб нехта са сваякоў яго знайшоў».

---

[1] Маецца на ўвазе касцёл кармелітаў.

[2] Даніэль Казімір Нарбут (?1738 — 1807) з 1783 па 1801 г. быў лідскім дэканам і пробашчам, у 1801 г. гэтую пасаду заняў кс. Вінцэнты Нарбут. Бацька Даніэля Казіміра Нарбута — Казімір Нарбут быў прадзедам Тэадора Нарбута, а дзед Тэадора Ігнацы — родным братам Даніэля Казіміра Нарбута, такім чынам Тэадор быў яго ўнучатым пляменнікам.



*Сітуацыйны план, 1947 г.*

У 1846 г. парэшткі памерлых з гэтага склепа былі перапахаваны ў зямлю на старых гарадскіх могілках.

Касцёл агароджвала мураваная сцяна, знутры якой знаходзіліся могілкі для простых парафіян. У візітацыі 1777 г. пра гэтыя могілкі пісалі так:

«Могілкі каля касцёла цалкам агароджаны мурам, прасторныя.

Ад вуліцы агароджа пабудавана за кошт ягамосцяў фундатараў, астатнія муры — коштам ксяндза-пробашча. Пабудова мура цалкам не закончаная, не дабудавана палова стаі[1]. На заканчэнне агароджы ўжо назапашана цэгла, і вясной будоўля можа быць закончана. Брама з могілак на вуліцу крытая бляхай, пабудаваная ягамосцямі фундатарамі. Дзверы ў браме на жалезных завесах, ушчыльненне дзвярэй упала, бо было без жалезных цвікоў. У браме двое малых дзвярэй на завесах, з клямкамі і зашчапкамі. Ад бабінца[2] праз браму ажно да вуліцы намаганнямі... пробашча дарога забрукавана».

На гэтых могілках у 1794 г. былі пахаваныя паўстанцы Тадэвуша Касцюшкі — пра гэта меўся запіс у метрычных актах Лідскага касцёла за 1794 г., Міхал Шымялевіч пісаў:

«Усе забітыя падчас аблогі рускімі войскамі г. Ліды пахаваны ў горадзе ў межах касцельнай агароджы».

## Дэканка

Гэтак звалася мясцовасць з лугамі і ставамі паміж фарным касцёлам і рэчкай Лідзейкай. Тут жылі лідскія дэканы і адсюль назва, якой шырока карысталіся яшчэ ў 1950–60-я гг., да пабудовы тут дзіцячага садка і гасцініцы. У гэтай мясцовасці маецца і больш старажытная назва, якая захоўвалася амаль пяць стагоддзяў, — Тахтамышаў двор.

---

[1] Стая (staja, staje) — мера даўжыні, найчасцей каля 200 м.

[2] Бабінец — пярэдняя частка культавага збудавання, прызначаная для жанчын, з'яўляўся часткаю асноўнага аб'ёму пад харамі. Часам бабінцам называлі прыбудову да храма з боку галоўнага фасада.



*Фара ў канцы 1950-х гг. Калаж Віталя Бурака.*

Справа ў тым, што ў 1397–98 гг., падчас княжання Вітаўта, у адмысловым доме ці ў вялікай юрце на беразе Лідзейкі ў раёне нашага горада, які потым назавуць Дэканкай, са сваімі жонкамі, дзецьмі і дружынай жыў былы хан Залатой Арды Тахтамыш.

Многія татарскія феадалы прызнавалі Тахтамыша ханам у выгнанні. Вялікі князь Вітаўт разлічваў вярнуць Тахтамышу рэальную ўладу ў Залатой Ардзе і ўзамен атрымаць ад яго ярлык на Вялікае княства Уладзімірскае з цэнтрам у Маскве, якое заставалася васалам Арды. Аднак у бітве на Ворскле (1399 г.) войскі Вітаўта ў складзе якіх знаходзілася і дружына Тахтамыша, былі разбіты. Тахтамыш уцёк у Сібір, дзе быў забіты ханам Шадыбекам.

Наша славутая паэтка Данута Бічэль пісала:

*Пералётны хан Тахтамыш*
*начаваў пад мурамі, як мыш.*
*Тут хапала ўсяго яго войску,*
*але Вітаўт павёў іх*
*на Ворсклу...*



*Фара і плябанія, 1917 г.*

Дадам трошкі ўспамінаў пра ўжо забыты раён Ліды Дэканку.

Яўгенія Ярмант пісала:

> «Па суседстве з замкам размяшчаліся вялікія будынкі грамадскага прызначэння. Недалёка ад руін замка стаяў велізарны белы касцёл. Ад вуліцы яго адгароджвала доўгая белая сцяна.
> За касцёлам раскінуліся Дэканка — луг і сажалкі, куды мы зімой хадзілі катацца на каньках. ... Лідзейка не замярзала нават у самыя суровыя зімы. Для катання на каньках мы выкарыстоўвалі... вялікія сажалкі, якія знаходзіліся на Дэканцы, куды мы мелі доступ без усялякіх абмежаванняў. Для дарослых і тых, хто мог добра катацца на каньках, меўся каток унутры замкавых сцен».

Лідзянін Зіновій Бянько расказваў мне:

> «У годзе 1943 ці 44-м мы сядзелі тут, каля мураванага плоту касцёла. Якраз перад касцёлам праязджаў нямецкі вайсковы грузавік. А з намі быў адзін больш дарослы хлопец. Ён свіснуў і паказаў немцам на колы — як быццам з машынай нешта здарылася.

Шафёр спыніў аўтамабіль, абышоў яго, а мы як ірванулі ў Дэканку… немцы стаялі каля машыны і смяяліся».

Ларыса Канчэўская ўспамінала:

«…назву (Дэканка) не тое што помнілі, а яна была агульнаўжывальнай для карэнных жыхароў. Калі мы прыехалі ў Ліду ў 1954 г… я акунулася ў асяроддзе мясцовых жыхароў… і мы пасяліліся ў самым апошнім доміку справа на вуліцы Калініна ў г. Лідзе. Домік быў невялікі, ахайны, з садком і агародам. Гаспадарамі былі цётка Марыся і дзядзька Саша Тарашчук. … Ад яе я пачула назву Дэканка. Яна, калі казала гэтае слова, паказвала ў бок, дзе цякла рэчка. І я была ўпэўнена, што ў горадзе ёсць яшчэ адна рэчка — Дэканка. Пазней я зразумела, што так называецца месца побач з галоўным касцёлам, дзе здаўна жылі ксяндзы, а частка зямлі належала Лідскаму дэканату…
За фарным касцёлам плёскалася маляўнічае возера, усё ў зеляніне. На яго беразе ў садзе стаяў стары вялікі драўляны дом, дзе жылі нашы настаўнікі: Аляксандра Мікалаеўна Сasноўская, настаўніца геаграфіі, з мужам Робертам Юр'евічам, падпольшчыкам, партызанам, і дачкой Геняй. Мы часта бывалі ў іх, рыхтуючыся да паходаў, спявалі песні з самім Сасноўскім, добрым, вельмі сціплым чалавекам. Тут жа была кватэра нашага настаўніка фізкультуры Георгія Фёдаравіча Бурака і яго жонкі Аляксандры Аляксандраўны, выкладчыцы беларускай мовы, паэткі.
Паколькі возера было праз дарогу ад нашай школы №8 (тут цяпер музычны каледж), мы бегалі на вялікіх перапынках купацца, калі верасень або май былі цёплымі. Я ніколі не страчвала такой магчымасці. Але глыбока не заходзіла. Гэтыя вар'яты хлапчукі маглі прымусіць насёрбацца вады з глеем! Там такое тварылася! Вярталіся мы на ўрок з мокрымі галовамі, спехам нацягваючы школьную форму на мокрыя целы, майку і трусікі. Галоўнае было высушыць коскі да прыходу дадому, інакш «лупцоўкі» не пазбегнуць. Але задавальненне пакрывала ўсе ангіны, атыты, бранхіты, лішаі і ўсякую іншую хваробу».



*У касцёле, люты 2026 г.*

# Дататкі

## Спіс Лідскіх пробашчаў[1]

1460 — прыход прыняў ксёндз Стагнеў.

1554 — ксёндз Ян з Данатава, віленскі прэбендарый[2] атрымаў Лідскі прыход, касцёл быў пераведзены пад кіраванне адміністратараў, даходы ішлі Віленскай капітуле, з-за чаго гаспадарка заняпала.

1559 — ксёндз Ян Андрэевіч, біскуп лідскі і берасцейскі.

1580 — ксёндз Ян Юшынскі, з яго пачынаюць пробашчы называцца Лідскімі і Крупскімі.

1622 ксёндз Ян Хрызастом Рагнятоўскі.

1650 — ксёндз Адам Ліпніцкі, дэкан Лідскі.

1657 — ксёндз Марцін Длужнеўскі.

1662 — ксёндз Ігнацы Рэберт.

1688 — ксёндз Станіслаў Відмунт Відымоўскі.

1700 — ксёндз Ян Даўгерд.

1738 — ксёндз Пётр Стракоўскі.

1747 — ксёндз Міхаіл Зянковіч, віленскі біскуп, заснавальнік каменнага касцёла, які перанесены на іншае месца з падзамча, дзе зараз пляц перад Домам Скарбовай касы.

1760 — ксёндз Станіслаў Богуш Сестранцэвіч, канонік жмудзкі.

1766 — ксёндз Антоні Эйсмант.

1783 — ксёндз Казімір Нарбут, экс-піяр, апат парадыйскі, кавалер Ордэна Святога Станіслава.

---

[1] Narbutt T. Cokolwiek z historyi miasta Lidy // Narbutt T. Dzieje starozytne narodu litewskiego. T. 5. Wilno, 1839. Dodatek I. S. 1–2.

[2] Духоўная асоба, якая кіравала касцельнай акругай і атрымлівала ад яе прыбытак (прэбенду).

1801 — ксёндз Вінцэнт Нарбут, канонік інфлянцкі, дэкан лідскі.

1826 — ксёндз Рачынскі.

1831 — ксёндз Вінцэнт Лінкім, дэкан лідскі.

## Стары дакумент фарнага касцёла[1]

Ксёндз Казімір Нарбут, які быў 20 гадоў лідскім пробашчам, стала жыў у Варшаве і Радзыміне. На ягоным душпастырскім месцы яго замянялі найманыя святары — звычайныя ці законныя (манахі), часцей гэта былі кармеліты Лідскага канвенту. Пры гэтым пробаствам фактычна кіраваў наняты эканом «загадчык плябані», якім з 1783 г. быў Павел Багінскі, падданы пана Войцеха Нарбута, лідскага войскага — брата ксяндза-пробашча. Ніжэй пададзены дакумент (у маёй літаратурнай апрацоўцы) знаходзіцца ў мяне (Міхала Шымялевіча — *Л. Л.*). Гэты дакумент — цікавае адлюстраванне гаспадарчых стасункаў у нашым краі пры канцы XVIII ст. Ніжэй пададзены дакумент — інструкцыя Паўлу Багінскаму, «фінансаваму загадчыку» лідскай плябаніі:

1. Павел Багінскі пра ўсё будзе павінен дакладаць ягамосці Нарбуту, лідскаму войскаму, і грошы з даходаў за квіткі аддаваць яму.
2. Прыме гаспадарку са згоды грамады.
3. Будзе весці ўлік падданых з зямлёй і прыладамі, з павіннасцямі, чыншамі, пабудовамі і публічнымі падаткамі.
4. Будзе весці спіс вёсак, зямлі, лугоў і г.д., а таксама межаў і іншых важкіх рэчаў.
5. Будзе весці ўлік быдла, коней, свіней, птушак, а таксама земляробчых прыстасаванняў.

---

[1] Шымялевіч Міхал. Збор твораў / укл. Л. Лаўрэш. Гродна, 2019. С. 128–130.

6. Кантраляваць стан усялякіх пабудоў, корчмаў, юрыдык і г. д.

7. Сее азімыя і яравыя, таксама апіша.

8. Розныя даходы з працэнтаў, выдэркафаў[1], ссыпак, дзесяцін, парубак з лясоў і г. д. запіша.

9. Будзе старацца пра даўнія рахункі шынкоў.

10. Будзе весці ўлік усялякіх выдаткаў, як публічных, гэтак і на ксяндзоў, чэлядзь і г. д.

11. Будзе сам кіраваць цагельняй і заўсёды мець запас цэглы.

12. Загадзя рыхтаваць вапну.

13. З цяжкімі пытаннямі межаў звяртаецца да ягамосці войскага Нарбута.

14. Для ксяндза трымаць пару коней, фурманку, чалавека, хлопца і кухара ці старую гаспадыню. З ксяндзом дамаўляецца пра фураж для коней.

15. Касцельныя даходы забіраць у ксяндза штомесяц, падпісваць рэестры і перадаваць да ягамосці войскага Нарбута, у войскага за здадзеныя грошы браць квіткі.

16. Шынкарам за раз шмат трункаў даваць, зводзіць з імі рахункі і забіраць грошы ў суботу.

17. Зрабіць лядоўню. Мець добрае піва ў бутэльках і добрую гарэлку. Піва зварыць у сакавіку і захоўваць у лядоўні.

18. Трымаць значную колькасць кароў, збіраць масла на сойм, бітую птушку таксама дасылаць у Гародню.

19. Ахвяраванні касцёлу, палотны, воск і г. д. забіраць сябе і запісваць.

20. Задавальняць патрэбы касцёла: рамонты, свечкі, лямпы.

21. Заўсёды, асабліва ў плябаніі і ў фальварку, мець бочкі для вады, драбіны, пажарныя бусакі і іншыя пажар-

---

[1] Выкуп, права выкупу, продаж з правам выкупу, з’яўляўся формай крэдытнага кантракту — *Л. Л.*

ныя прыстасаванні. Коміны трымаць чыстымі, падрыхтаваць ліхтары для касцёла і фальварка.

22. Трымаць рэестр усіх рэчаў.

23. Клапаціцца пра падданых, пры неабходнасці выклікаць лекара і плаціць, ведаць патрэбы кожнага. У карах быць асцярожным, пільнаваць, каб часта на гандаль не ездзілі і не прадавалі свайго збожжа.

24. Пры адсутнасці ягамосці войскага звяртацца па параду да ягамосці Нарбута — стольніка.

25. Мне пісаць кожны тыдзень і адразу паведамляць, што пра справы, а потым — што робіцца, таксама нагадваць ксяндзу, каб паведамляў аб справах касцёла.

26. Усё пераняўшы, скласці спіс служак як у фальварку, так і ў касцёле, колькі будзе.

27. Плату людзям вымяраць паводле звычаяў гэтага краю; гэтак жа і з шынкарамі; мець інфармацыю, што ім даецца за гандаль.

28. Па меры магчымасці ашчаджаць грошы.

29. Калі нехта будзе збываць прыпасы па патрэбе ці з шынкоў, дык вывозіць на продаж у Вільню. Але ніколі не пакідаць дом без прыпасаў, лепей мець больш, асабліва ўвесну, калі людзям патрэбна дапамога.

30. Ведаць памеры абшараў палёў і лугоў, пры неабходнасці трымаць парабкаў, быкоў і коней для работы, мець 4 кані і добрыя вазы для вывазу збожжа з поля і на продаж.

31. Дамовіцца з ягамосцю войскім пра соль, ці купляць яе ў Вільні, ці зімой прывезці з Рыгі для людзей, дамовіцца пра цану.

32. Каб не забыць, усё для памяці сваёй запісваць, каб мноства рэчаў на пачатку не прывяло да памылкі.

33. Будзеш інфармаваць, ці не трэба прывезці французскага віна для касцёла і ў шынок.

34. Можа б не перашкаджала для ўласнай патрэбы ўжываць мёд.

35. Калі пры бровары можна будзе карміць быкоў і свіней, дык гэта выкарыстаць.

Усе гэтыя пункты п. Багінскі пакажа ягамосці войскаму, і дамову з ім падпіша, і будзе выконваць.

*Дня 10 ліпеня 1783 у Радзыміне.*

*Кс. Казімір Нарбут.*

Багінскаму я дазволіў мець уласнага каня, каб мець зручнасці і заробак. У 1784 г. 22 жніўня таму ж Багінскаму дазволіў трымаць другога каня.

*Кс. Казімір Нарбут.*

1785 год. 15 ліпеня. У Радзыміне.

Распараджэнне, дадзенае пану Паўлу Багінскаму, загадчыку лідскай плябані.

Прагледзеўшы рахункі і тлумачэнні, я заўважаю надзвычайныя выдаткі на ўсё, шмат пазычана грошай і збожжа, пропускі ў запісе кожнай рэчы. Таму раблю наступныя распараджэнні:

1. Каб кожная рэч была запісана ў прыход і расход, гэта значыць прыход збожжа ў снапе і ў зерні, прыход быдла, авечак, свіней, коней і птушак з прыплодам, прыход масла, сыру, сена, мёду, воску, алею, ільну, канопляў і г. д. Расход збожжа на пасеў і продаж, хлеб, асабліва для ксяндзоў, сябе і чэлядзі, расход кашы, сала, масла, сыроў, палатна, валовых скур, авечых скурак, свіней, птушкі і г.д., якія былі прададзены ці спажытыя.

2. Грошай не выдаткоўваць без парады з ягамосцю войскім лідскім, да якога звяртацца па кожнай справе, слухацца яго рад і штомесяц аддаваць яму рахункі ці тады, калі ён захоча.

3. У свіран сам або жонка павінны хадзіць і ключы хаваць у сябе, але ніколі не давяраць іх цівуну.

4. Навучыцца падлічыць колькасць мукі для хлеба і сала, каб без лішку чэлядзь мела неабходнае.

5. Касцельныя даходы ў грошах і воску ў ксяндзоў павінен забіраць; грошы аддаваць ягамосці войскаму, а воск забіраць на патрэбы касцёла, за збожжа і іншыя рэчы, ад-

дадзеныя як правіянт, даваць ксяндзам квіткі, а сабраны як ахвяраванне хлеб аддаваць часткова лідскім, а часткова крупаўскім жабракам, а рэшту выдаткоўваць на чэлядзь ашчадна, каб не было лішку.

6. Ні грошай, ні збожжа нікому не пазычаць без дазволу ягамосці войскага, апрача сваіх падданых, якім насамрэч патрэбна, а што каму пазычаецца, адразу запісваць і вызначыць тэрмін, калі павінен аддаць.

7. Запісваць таксама звезеныя цэглу і вапну.

8. Ад арандатараў не браць грошай па частках, а толькі ў тэрмін.

9. Прыход і расход гарэлкі запісваць, чэлядзі даваць толькі на святы, цівунам — калі верныя і пільныя, дык можна часцей; іншым — толькі калі была вельмі важная работа дапазна.

10. Не дазваляю аніякіх экстраардынарных выдаткаў, напрыклад падчас судоў, сходаў або іншых з’ездаў. Ніхто з маіх братоў не мае права загадваць, таксама як і ксяндзы, якія жывуць на плябані, толькі сам ягамосьць войскі лідскі мае ўладу і права распараджацца, без яго выразнага загаду нікому нічога не даваць, нават маім родным.

11. Мураванага дома на могілках нікому не наймаць, а чакаць распараджэння ягамосці войскага.

12. Каб уберагчыся ад празмерных выдаткаў, на ўсё складці табліцу расходаў для сябе і чэлядзі, якую ягамосць войскі павінен зацвердзіць.

*Радзымін, год 1785, 21 ліпеня.*

*Кс. Казімір Нарбут, лідскі пробашч.*

## Францішак Смуглевіч[1]

Францішак Смуглевіч нарадзіўся ў Варшаве 6 кастрычніка 1745 г., у бацькі, мастака Лукаша і маці, пляменніцы славутага Шымана Чаховіча. Яго браты Антон і Люцыян

таксама былі мастакамі. Першы з іх стаў знаным у Вільні мастаком-дэкаратарам старога тэатра ў палацы Аскеркаў. Ф. Смуглевіч вучыўся ў Чаховіча, а потым у Акадэміі св. Лукі ў Рыме.

Ва ўзросце 20 гадоў ён ужо атрымаў славу, роўную славе Давіда, адрадзіцеля французскага жывапісу. Быў вучнем знакамітага Рафаэля Менгса, не дасягнуў узроўню прыгожай каларыстыкі свайго настаўніка, але пераўзышоў яго ў экспрэсіі малюнка. У часы жыцця ў Італіі яго фінансава падтрымліваў кароль Станіслаў Аўгуст, ад якога потым, за свае мастацкія дасягненні ён атрымаў залаты медаль *Merentibus*. У 1785 г. вярнуўся ў край. Маляваў у Варшаве, найбольш прыкметнай яго карцінай сталі: «Найсвяцейшая Панна ў атачэнні апосталаў», «Смерць св. Базыля» і «св. Ануфры». У Вільні ў катэдры маюцца яго слынныя «Дваццаць апосталаў», «Мелхіседэк», «Памнажэння хлябоў у пустыні», (значна лепшыя па колерах і кампазіцыі, чым суседнія карціны Вілані), «св. Ян Непамуцен». З іншых віленскіх абразоў: «св. Каэтан памнажае хлябы», «Развітанне са святымі Пятром і Паўлам» і іншыя. У Варшаве Смуглевіч некаторы час меў школу жывапісу. 1 кастрычніка 1797 г. (паводле знойдзеных нататак праф. М. Палінскага) атрымаў годнасць прафесара рысунку і жывапісу ў Галоўнай Школе (Віленскім універсітэце), напачатку выкладаў на фізічным, а з 1803 г. — на гуманітарным факультэце. Выкладаў з вялікім поспехам, але не мог пераадолець забабоны гараджан і таму не выкарыстоўвай жывую мадэль, і ён меў вельмі абмежаваную колькасць злепкаў з класічных скульптур.

Яму дапамагалі такія выключана таленавітыя ад'юнкты ўніверсітэта як Пешка, Дамель, Ян Храсціцкі і Рустэм, які пасля смерці Смуглевіча 18.10.1807 г. заняў яго кафед-

[1] Lucjan Uziębło. Franciszek Smuglewicz (1745–1807) // Słowo. 1927. №219.

ру. Лепшымі вучнямі Смуглевіча былі: Антон Бялькевіч, пераважна мастак гістарычных тэм, Гаспар Бароўскі, таксама гістарычны мастак і пераймальнік Смуглевіча, Брушкевіч Ігнат, партрэтыст і настаўнік гімназіі, Лізандэр, партрэтыст, Юзаф Аляшкевіч, рэлігійны мастак (вядомы містык), Францішак Пелікан, таленавіты мініяцюрыст, паводле яго малюнка ў 1799 г. была зроблена гравюра з выявай Маці Божай, якая спыняе маравую чуму ў Вільні.

Сярод гістарычных карцін Смуглевіча, якія асабліва цікавы нашаму краю, можна назваць «Зацвярджэнне нададзенай сялянам уставы ў Паўлаве каля Вільні ў 1769 г. канонікам Віленскім, рэферэндарыем ВКЛ п. Ксаверыем Бжастоўскім», «Ахвяра Вясталкі», сярод лепшых прац Смуглевіча карціна з партрэтам княгіні дэ Лігне з дому Масальскіх, «Смерць генерала Якуба Ясінскага 4 лістапада 1794 г.», «Генерал Ясінскі, абапіраючыся на меч, топча мёртвую галаву, сімвал пагады да смерці», «Акт аддзялення Літвы ад Мазавецкага княства ў 1358 г.», «Сесія Люблінскага трыбуналу пад патранатам Каэтана Алізара, кароннага пастолія, у прысутнасці караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага», «Сямейны партрэт Прозараў» — медальён з бюстам Прозара, смаленскага ваяводы, трымаюць яго сыны. Іншыя партрэты: Станіслава Аўгуста, аўтапартрэт мастака, партрэт віленскага каноніка кс. Мікалая Тышкевіча і партрэт п. Граноўскай, які знаходзіцца ў зборах Таварыства аматараў навук. Згадаем, што прафесар Смуглевіч за роспіс плафона, які аздобіў залу ўніверсітэта, 26 красавіка 1805 г. пры пасярэдніцтве куратара ўніверсітэта, атрымаў дыяментавы пярсцёнак ад імператара Аляксандра I (з нататак прафесара М. Палінскага).

У 1912 г. кнігар Ф. Завадскі пад рэдакцыяй Вацлава Студніцкага і С. Пешкі, а таксама пад мастацкім кіраўніцтвам прафесара Ф. Рушчыца, выдаў вельмі прыгожы альбом відаў Вільні, заснаваны на акварэлях Смуглевіча, выкананых з натуры, арыгіналы знаходзяцца ў Кракаве

ў музеі братоў Чапскіх. У гэтым альбоме рэпрадуктаваны 21 з 24 ацалеўшых малюнкаў старой Вільні. Заслужаная кнігарская фірма павінна была б перавыдаць гэты альбом, бо першы наклад даўно ўжо стаў вялікай рэдкасцю.

Смуглевіч моцна любіў свой край. Яго не зманілі добрыя ўмовы працы ў Англіі, ён меў шмат заказаў ад замежнікаў, але імкнуўся працаваць на бацькаўшчыне.

У нашых касцёлах і дварах ёсць шмат твораў Смуглевіча, чыя творчасць і нястомная працавітасць выклікаюць захапленне. Ён меў намер выдаць 200, потым толькі 100 гістарычных ілюстрацый. Але з-за цяжкасцяў з пошукамі гравёраў для выдання, атрымалася толькі 9.

Смуглевіч, безумоўна, не быў майстрам, якога стыль, праўда і бляск ўзвышаліся над акадэмізмам формы, руцінных колераў і тэхнікі, але ніхто не аспрэчыць самага высокага становішча Смуглевіча як першага ў краі, хто стварыў незалежныя і творчыя напрамкі ў рэлігійным, гістарычным і жанравым жывапісе. Ён не быў такім бяздушным і няпэўным у каларыстыцы, як часам здавалася крытыкам. Яго прыхільнікі-сучаснікі, як маглі, баранілі Смуглевіча ад націску фанатыкаў эстэтыкі. Вось які адказ атрымаў вядомы драматург Кацэбу ад паэта Антона Шагіна за бессаромны напад на славу пэндзля Смуглевіча:

*Дарма немец паклёпніцкае пяро у жоўць мачае*
*І чорныя пасквілі ў подлым друку піхае*

Нягледзячы на сціплыя патрэбы, мастак не здолеў забяспечыць сябе бесклапотнае існаванне ў старасці. Ён памёр пасля працяглай хваробы ад вадзянкі і пахаваны ў катакомбах могілак Росы.

# Фрагмент успамінаў Івана Любарскага[1]

*Любарский Іван Васільевіч (1832–1901), закончыў медыцынскі факультэт Харкаўскага універсітэта, ваенны лекар, гісторык, журналіст, у Лідзе служыў палкавым лекарам.*

У Лідзе, якая налічвала ў той час дзве з невялікім тысячы жыхароў, былі тры велічэзныя мураваныя касцёлы выдатнай архітэктуры, якія высока і ганарліва ўздымалі да неба свае прыгожыя шпіцы....

Зайшоў я адзін раз у касцёл[2] і патрапіў у такі цесны натоўп, што нельга было паварушыцца. Быў несвяточны нядзельны дзень, калі касцёл звычайна напаўняецца толькі на палову, а тут прысутнічаў літаральна ўвесь горад, нібы на адпуст (храмавае свята). Не могучы растлумачыць сабе гэтую з'яву, я адчуваў, што бесперапынна прыбываюць усё новыя і новыя багамольцы і ўтвараюць суцэльную масу, якая ціснула з усіх бакоў. Тым не менш, я цярпліва пераносіў ціск і задуху, сочачы з цікаўнасцю за ходам імшы, каб параўнаць яе з праваслаўнай. Пры канцы на высокай кафедры на бакавой сцяне з'явіўся невядомы прапаведнік у сутане капуцына і адразу прыкаваў да сябе агульную ўвагу. Капуцынскага кляштара ні ў горадзе, ні ў суседстве не было; такім чынам, новы твар з'явіўся здалёку. Гэта быў чалавек гадоў пад трыццаць, з паголенай па-манаску галавой, высокі і сухарлявы, апрануты ў тоўстае цёмна-шэрае сукно і падперазаны вяроўкай; на левым запясці — буйныя пацеркі, у выглядзе ланцуга, з вялікім крыжам. Даўгаваты твар, рэзкая зморшчына паміж бровамі, нос гарбінкай, тонкія стуленыя вусны і глыбокія, іскрыстыя вочы, абведзеныя сіняватымі кругамі, — усе гэтыя рысы выяўлялі ў ка-

---

[1] Любарский И. В. В мятежном крае. (Из воспоминаний). // Исторический вестник. Март, 1895. С.813—816.

[2] Фарны касцёл

пуцыне розум, энергію, рашучасць. Ён схіліўся над кафедрай як бы ў нямой малітве, потым выпрастаўся на ўвесь рост, абвёў фасфарычным поглядам прысутных, падняў уверх правую руку і загаварыў. Гаворка яго, спачатку ціхая і спакойная, паступовае прымала гарачае адценне, часам прыпадабнялася бурнай хвалі і кідала на слухачоў грамы заклікаў. Ксёндз прамаўляў пра Радзіму і да такой ступені меў магнетычны уплыў на людзей, што натоўп, здавалася, гатовы быў рынуцца туды, куды ён пакажа. Дастаткова сказаць, што я, староннні і выпадковы слухач, мімаволі адчуваў нервовую дрыготку ва ўсім целе, а з масы слухачоў няспынна вырываліся гучныя ўздыхі, і сотні кулакоў шчыра стукалі ў замілаваныя грудзі. Сцісла гэтае палітычнае казанне можна прыблізна фармуляваць так: «Бог пасылае выпрабаванні нават сваім абраным народам. Мы, ... заўсёды вызнавалі праўдзівую каталіцкую веру, ... — тую веру, па-за якой няма выратавання чалавечым душам, і тым не менш Богу заўгодна было выпрабаваць свой ўпадабаны люд, дазволіць каб яго заняволіла варварская і ерэтычная ўлада, якая адняла грамадзянскія правы і свабоду сумлення, усё, што складае самы дарагі і святы здабытак чалавека на зямлі. Мы бясконца доўга і цярпліва пераносілі свае пакуты, і Выратавальнік свету зараз пераканаўся ў непахіснай пэўнасці свайго народа Яго святым запаветам. Слухайце ...! Імем Усемагутнага Бога ўзвяшчаю вам, ... што надышоў канец нашым катаванням. Набліжаецца хвіліна, калі Бог разаб'е вашы кайданы і даруе нам згубленае зямное шчасце. Збавіцель ідзе да нас, і блажэнны той муж, якога ён сустрэне падрыхтаваным. Будзьце ж гатовыя прынесці ўсякія ахвяры на алтар Айчыны; ахвяруйце ўсім, хто чым валодае, нясіце davеранaым людзям грошы, рэчы, увесь здабытак, а калі прыйдзе час — жыццё. У імя святога нашага касцёла і дарагой Айчыны бацькі павінны на час адмовіцца ад сваіх сямействаў, мужы ад жонак, мацярэй і дзяцей, нявесты ад жаніхоў, падначаленыя ад свайго начальства і дружна выступіць на справу вызвалення Бацькаўшчыны... Але гора

таму, хто па абыякавасці ці ад страху застанецца ўбаку ад усеагульнага руху. На іх абрынецца з неба гром і ўразіць на смерць без пакаяння, знічператворыць у попел усю іх маёмасць, а на тым свеце чакае здраднікаў вечная пякельная пакута. Маліцеся, ды хай Ісус Хрыстос і Маці Божая асвятляюць сэрцы вашыя і накіроўваюць вас на богадагодныя вычыны... На калені!

Усе адразу укленчылі, абвясціўшы паветра стогнамі і плачам. Гараднічым[1] і ўсе павятовыя ўлады без ваганняў выканалі каманду. Засталіся на нагах толькі я і адзін з паліцэйскіх, які стаяў наперадзе мяне. Капуцын бліснуў вачамі і ўладна прагаварыў: «Я бачу, што тут, у гэтым святым храме, прысутнічаюць іншаверцы; але ўсё роўна, замаўляю і іх злучыцца ў агульнай малітве, інакш яны адразу панясуць кару Божую». Становішча выйшла крытычнае. ... паліцыянт пачаў уладкоўвацца на калені, ..., а я, скарыстаўшыся гэтай паўзай, прасунуўся за шырокую калону, каля якой стаяў. Ксёндз супакоіўся і зноў працягваў сваю блюзнерскую і абуральную прамову, пратрымаўшы на каленях пакорлівую паству з чвэрць гадзіны". Пры канцы, капуцын выйшаў з алтара „з выразам смутку і стомы на твары і, сціпла патупіўшы вочы, стаў прабірацца праз натоўп з велізарным падносам на руках. Яго суправаджаў павятовы суддзя[2] з запасным падносам, апушчаным уніз. З усіх бакоў працягнуліся рукі, і ахвяраванні багатым дажджом пасыпаліся на паднос прапаведніка: медзякі, срэбра, асігнацыі, нават вельмі буйныя, кашалькі і партманетка з усім змесцівам, бранзалеты, завушніцы, гадзіннікі, адразу

---

[1] Гараднічы ў Лідзе 1861 г., падпалкоўнік Балонін. Гл.: Памятная книжка Виленской губернии на 1861 г. Вильно, 1861. ч. 1. С. 110.

[2] Павятовы суддзя ў Лідзе 1861 г., калежскі асэсар Фама Іванавіч Шукевіч. (Гл.: Памятная книжка Виленской губернии на 1861 г. Вильно, 1861. ч. 1. С. 111.), Тамаш Шукевіч — адзін з кіраўнікоў паўстання на Лідчыне, павятовы камісар.

ўтварылі такую кучу, што класці больш не было куды. Напоўнены паднос змяняўся запасным з рук суддзі, які адносіў усё сабранае ў алтар і зноў спяшаўся да капуцына з пустым падносам. Чым усё гэта скончылася, я не бачыў, таму што паспяшаўся прыбрацца па-добраму, але чуваць было, што, па заканчэнні набажэнства, у першы раз у Лідзе былі праспяваць у касцёле нейкія новыя песні быццам бы рэлігійныя, але ў сутнасці рэвалюцыйнага зместу.

З таго часу я зарокся больш заходзіць у касцёл і цэлы дзень адчуваў такое нервовае засмучэнне, што ніяк не мог супакоіцца. А калі ўвечары расказаў усё, выпадкова убачанае і пачутае аднаму нашаму старому маёру, які больш за іншых у палку абураўся антырасейскімі праявамі, то дасведчаны служака заўважыў: «пачакайце, яшчэ не тое ўбачым пры гэтакім злачынным папушчальніцтве ўладаў. Гараднічы павінен бы арыштаваць нягодніка, а ён, балюе зараз з ксяндзамі, ды дапамагае ім „офяры“ (ахвяраванні) лічыць. А што зробіш? Войскам загадана не ўмешвацца ў такія справы».

Аказалася, што шматлікае зборышча ў касцёле было не выпадковая, людзі прыйшлі туды па позве мясцовых ксяндзоў; ў іншым касцёле знарок не было службы ў тую нядзелю. З тых часоў капуцын больш не паказваўся ў нашым мястэчку. Пазней я даведаўся, што гэта быў адзін з самых фанатычна эмісарам польскага «жонда». Ён беспераашкодна пераязджаў з горада ў горад, з мястэчка ў мястэчка, усюды казаў свае палымяныя пропаведзі і збіраў багатыя «офяры». Калі ж выбухнула паўстанне, тады гэты «слуга алтара» апынуўся ў шайцы Лялевеля[1], натхняў паўстанцаў з крыжам у руках і, нарэшце, у адной сутычцы быў забіты[2].

---

[1] Лелявель — мянушка Марціна Мацея Барэлоўскага (1829–1863), палітычнага і ваеннага дзеяча, палкоўнік у паўстанні 1863 г.

# Фрагмент з інвентарнага вопіса Лідскага рымска-каталіцкага касцёла і бенефіцыі ад 29 траўня 1882 года[3]

Згодна з інвентарным вопісам Лідскага рымска-каталіцкага касцёла і бенефіцыі ад 29 траўня 1882 года, касцёл:

«… без купалаў з франтонам і жалезным на версе крыжам. Над прэзбіторыем драўляны купалок з малым крыжыкам і невялікім звонам. Страха касцёла вельмі старая і цячэ, а франтон адрамантаваны ў 1878 г. і пакрыты жалезнаю бляхаю. Касцёл даўжынёю 15 сажняў і 5 вяршкоў, а шырынёю 7 сажняў 19 і (?) вяршкоў. Насупраць прэзбісторыюма прыбудаваны дзве сакрыстыі, у 1850 годзе ў іх вокны ўстаўлены жалезныя краты. Ад франтону праддзвер'е, дзверы з дзвюма форткамі. Хоры мураваныя, да іх лесвіца драўляная. Акон вялікіх 9, мен-

---

[2] Гэты капуцын — ксёндз Бжоска. Як пісаў П. Бранцаў «*адзін з самых фанатычных эмісараў польскага „жонду“. Ён бесперашкодна пераязджаў з горада ў горад, з мястэчка ў мястэчка, усюды прамаўляў свае казанні і збіраў багатыя ахвяраванні. Калі ж успыхнула паўстанне, дык гэта … (ён) апынуўся ў атрадзе Лелявеля, натхняў паўстанцаў з крыжам у руках і, нарэшце, у адной сутычцы быў забіты*» (Гл: Брянцев П. Д. Польский мятеж 1863. Вильна, 1891. С.79.). Вядома, што ў атрадзе Лелявеля шараговым байцом ваяваў ксёндз Бжоска, верагодна менавіта ён і выступаў у Лідзе і ўсхваляваў насельніцтва горада. Бжоска вучыўся ў Янашскай семінарыі (былўшай Люблінская губерня), у 1857 г. яго высвяцілі ў ксяндзы і прызначалі вікарыем у Саколку, потым у Луцк (былой Сядлецкай губерні). У 1862 г. ён сышоў да паўстанцаў, увесь час выступаў перад насельніцтвам. У 1863 г. быў у атрадзе Левандоўскага, а потым у Лелевеля, пасля разгрому атрада Лелявеля сам узначаліў атрад паўстанцаў. Арыштаваны толькі 17 красавіка 1865 г. і 11 траўня пакараны смерцю ў Саколцы.

[3] Лідскі Летапісец. 2002. №18. С. 9—15.

шых 5, з якіх 2 у сакрысціях. Пры рамонце будынка касцёла ўзамен трухлявых, устаўлены новыя вокны. Арган на 10 галасоў, у 1856 годзе адрамантаваны, з трыма мяхамі. Пад хорамі размяшчаецца пахавальны пастамент у тры ступені, моцны з новай труной. Дзвярэй з надворку 3, на жалезных завесах навешаных. Дзверы ў сакрыстыю з нутраным замком, унутры касцёла дзвярэй 6. Скляпенне мураванае. Падлога ў прэзбіторыюме і цераз сярэдзіну касцёла мармуровая, а па баках у 1847 годзе выкладзеная цаглінамі такой жа велічыні. Пад прэзбіторыюмам склеп, быўшыя ў ім целы мёртвых у 1846 годзе пахаваны ў зямлю. Амбон жалезны, у разеты вызалачаны, добрага аздаблення. Краты, што аддзяляюць прэзбіторыюм ад касцёла, на мармуровы колер, па баках дзве лаўкі пафарбаваныя ў сандалавы колер. Лавак у касцёле сасновых, чырвонага колеру па абодва бакі па 7, пастаўленых прыхаджанамі — 4. Фатэляў у прэзбіторыюме паліраваных, нанава шаўковай матэрыяй пакрытых, ахвяраваных у 1855 годзе п. п. Пашкоўскімі — 3, крэслаў з рызніцы старых — 2. Камоды са скрынкамі на складзе рыз з 2 шафкамі — 2, крыж з распяццем Хрыста — 1, люстэрка ў залочаных рамах — 1. Рукамыйнік з выяваю на версе Анёла Абярэжца, зроблены ў 1851 годзе кс. Хлявінскім. Другі камод з 6 скрынкамі, усё гэта памалявана малявідлам сандалавага колеру. Куфар вялікі для захоўвання бялізны ў 1846 годзе на зялёна пафарбаваны і куфар на складзе арнатаў (рызаў).

**Вопіс алтароў**

1. Алтар вялікі, мураваны на чатырох калонах, у 1861 годзе нанава памаляваны, пілястры ў касцёле і прэзбіторыюме пад мармуровы, падлога на блакітны колер памалёваная, калоны прэзбіторыюма на алебастравы колер і карнізы з пазалотаю аблезлаю. Паміж калонамі выява распяцця Ісуса Хрыста, створаная віленскім рэзчыкам Зімабро, ахвяраваная ў 1861 годзе Станіславам Вольскім. Уверсе над алтаром 4 анёлы гіпсавыя, па баках паміж ка-

лонамі статуі св. Апосталаў Пятра і Паўла, а таксама Св. Казіміра і Сафіі.

2. Пры ўваходзе, па левай руцэ — алтар Маці Божай Вострабрамскай двухпавярховы і а дзвюх калонах, мураваны, памаляваны ў мармуровы колер, а калоны — у алябастравы колер. На першым паверсе абраз Божай Маці Вастрабрамскай, у 1847 годзе жывапісцам Азямблоўскім на дубовай дошцы маляваны і дваранінам Янам Андрушкевічам ахвяраваны, а на 2-м паверсе абраз Маці Божай Ружанцовай ў срэбнай рызе (у срэбным акладзе).

3. На правую руку алтар мураваны, на падабенства алтара Божай Маці Вастрабрамскай, св. Язэпа ў пазалочаных рамах, намаляваны жывапісцам Мікульскім і ў 1853 годзе ахвяраваны ксяндзом Хлявінскім. На 2 паверсе абраз Маці Божай Шкаплернай.

4. Алтар драўляны блакітнага колеру, перамалёваны ў 1874 годзе на белы колер, калоны разныя, вызалочаныя, у ім абраз св. Станіслава, біскупа, намаляваны Мірскім, ахвяраваны ў 1856 годзе кс. Хлявінскім.

5. На калоне п'едэстал і прыступкі драўляныя, абраз св. Казіміра ў пазалочаных рамах, намаляваны Мірскім ахвяраваны ў 1855 годзе кс. Хлявінскім.

6. На супрацьлеглай калоне алтар св. Тэклі ў пазалочаных рамах з п'едэсталам і мураванымі прыступкамі.

7. Алтар св. Антонія на бела намаляваны ў 1874 годзе невядома кім маляваны аднолькавага абсталявання з алтаром пад №4.

На ўсіх алтарах знаходзяцца кансекраваныя каменні з мошчамі святых і каноны ў пераплётах за шклом».

# Пад возам і на возе (фрагмент з успамінаў ксяндза Юзафа Бародзіча)[1]

*Вікарый ў Лідзе (верасень 1898 — студзень 1899)*

...атрымаў распараджэнне на перавод вікарыем у Ліду. Губернатар вырашыў, што ў Лідзе за мной будзе лепшы нагляд ....

[...]

Ліда з'яўляецца павятовым горадам і вузлавой станцыяй на перакрыжаванні чыгуначных ліній — Палескай і Сядлецкай[2]. Каля горада паўсюдна растуць хвойныя лясы, глеба пясчаная. У горадзе маецца старажытны, але ўбогі касцёл у раманскім стылі[3]. У мае часы яго знешні выгляд быў варты жалю, выглядаў касцёл сумна і занядбана, да таго ж быў ён замалы, бо не мог умясціць нават чацвёртую частку вернікаў. Лідская парафія налічвала да 18 тысяч душ[4]. Яшчэ да студзеньскага паўстання 1863 г. у Лідзе меўся багаты кляштар з прыгожым касцёлам, але ён быў замкнуты Мураўёвым[5].

---

[1] Pod wozem i na wozie: pamiętniki Józefa Borodzicza, czyli kilka lat pracy duszpasterskiej na Litwie, Białej Rusi i w głębi Rosyi. Kraków, 1911. S. 15–16.; 17–23.

[2] Сядлецкая лінія (зараз Маладзечна — Ліда — Масты) пачала працаваць толькі у 1906 г.

[3] Маецца на ўвазе фарны касцёл пабудаваны ў другой палове XVIII ст. у стылі барока.

[4] У лідскую парафію ўваходзілі вернікі горада і значнай частцы павета.

[5] Маецца на ўвазе касцёл і кляштар піяраў, які пасля пажару 1843 г. не дзейнічаў і пасля 1863 г. быў перададзены праваслаўным.



*Ксёндз з дзецьмі каля фарнага касцёла, 1917 г.*

Аб вяртанні кляштарнага касцёла[1] ці аб дазволе на пабудову новага лідзяне прасілі здаўна, але поп Каяловіч заўсёды ім перашкаджаў бо даводзіў губернатару, што гэта было б шкодна для праваслаўя.

На ўзгорку, недалёка ад касцёла, яшчэ стаялі руіны старога замка[2]. Але калі імі ніхто не будзе апекавацца, дзякуючы яўрэям і маскоўскаму гаспадаранню, хутка ад замка і следу не застанецца.

Мясцовы вясковы люд бедны, але яўрэі вельмі багатыя. Гандаль і прамысловасць знаходзіцца ў іх руках, і яны нават арандуюць маёнткі. Адзіны Лясковіч[3] гаспадарыць сам, чым дае добры прыклад суседзям, якія пускаюць свае

---

[1] Відавочна, маецца на ўвазе касцёл кармеліцкага кляштара, які стаяў нядзейсны з часоў паўстання 1831 г.

[2] Сваявольная яўрэйская дзятва выломвае мур кавалкамі і скідвае ўніз замкавага ўзгорка. –заўвага кс. Бародзіча.

маёнткі ў арэнду.

Да часоў Мураўёва ў Лідзе віравала гандлёвае жыццё, але пасля паўстання 1863 г. горад заняпаў і ўжо ніколі не вярнуўся да стану ранейшага росквіту.

У горадзе і ваколіцах урад замяніў некалькі касцёлаў на цэрквы, а людзей альбо сілай перавёў у праваслаўе альбо як «упартых», неміласэрна праследаваў[4].

[...]

Казанні ў касцёле дазволена было прамаўляць толькі пробашчу, але толькі з выдадзенай урадам кніжкі Бялабрэскага. За імправізацыі падчас казанняў ксяндзу пагражала суровая кара.

* * *

Калі я прыехаў у Ліду, пробашчам, дэканам і катэхітам быў 60-ці гадовы стары — хворы і худы[5]. Не дзіва, што парафія была занядбана. Жывучы ў сталай небяспецы з боку паліцыі і папа, ён ратаваўся ад іх незвычайнай гасціннасцю. А яны злоўжывалі гасціннасцю пробашча гэтак моцна, што пры канцы яго плябанія замяніла ім рэстаран і дом картачнай гульні[6]. Сам гаспадар сядаў за картачны столік разам са сваімі гасцямі, каб адмыслова прайграць ім грошы і такім чынам даць хабар. Таму з'яўляўся кавале-

---

[3] Верагодна, маецца на ўвазе ўладальнік маёнтка Кір'янаўцы Станіслаў Лясковіч.

[4] Гаворка ідзе пра скасаванне уніі.

[5] Сянкевіч Юзаф, ксёндз-пробашч і дэкан у Лідзе ў 1889–1905 гг. Міхал Шымялевіч пісаў: *«У выказванні сваёй прыхільнасці да трону некаторыя ксяндзы перамагалі праваслаўных папоў. Лідскі дэкан Сянкевіч у святочныя дні аздобіў касцельную браму транспарантам, на якім была намалявана манаграма цара і царыцы з надпісам „Боже, царя храни“».* Зараз перапахаваны на Слабадскіх могілках.

[6] Жырмунскі ксёндз Генрык Бальцэвіч пісаў: *«Інтэлігенцыя не працуе з народам і ўвесь свой час праводзіць за картамі. Ксёндз ёсць „пажондным“ партнёрам калі не хапае чацвёртага. Карцёжная гульня ёсць адзіным нашым інтэлектуальным высілкам у правінцыі, цэнтрам гэтага руху ча-*

рам розных ордэнаў імперыі і нават адзначаны манархам крыжам з надпісам: *«Доброму пастырю за хороший пример»*[7].

Горш было з вікарыямі, асабліва з тымі, якія не жадалі падпарадкоўвацца «ўставам» Мураўёва. Ксёндз-дэкан гамаваў запал маладых і даваў ім бацькоўскія парады:

— Асцярожна, — казаў.

— Мой дарагі, за табой ужо жандары сочаць, поп данёс. І, што? Кар'еру сабе сапсуеш і мне клопату наробіш!

Відавочна, адразу пасля прыезду ў Ліду, ксёндз-дэкан накіраваў мяне з візітам да спраўніка Ляўданскага[8]. Гэты чыноўнік прапанаваў мне прыняць яго пратэкцыю і прачытаў лекцыю пра лаяльнасць і правільныя думкі. Пры

---

*ста ёсць плябанія а варштатам капланскай працы — зялёны столік. За картамі, „інтэлектуальнай“ ежай служаць плёткі, „тоўстыя“ нясмешныя анекдоты і ў самым лепшым выпадку палітыка, якая разумеецца на газетным узроўні»* — цыт. па: Bolcewicz Henryk. Stosunki kościelne na Litwie: listy otwarte księdza do księży. Monachium, 1905. S. 67.

[7] Той жа Генрык Бальцэвіч пісаў: «*У Гародні, на такой важнай пляцоўцы, з усіх бакоў абкладзенай праваслаўем і русіфікацыяй, дэканам ёсць разбэшчаны пошукам выгады ксёндз, скончаны сібарыт, адзінай мэтай якога ёсць падабацца ўраду. Ва ўсіх павятовых гарадах нашай дыяцэзіі сядзяць дэканы альбо рашуча праўрадавыя (Ясевіч, Сайкоўскі), альбо несвядомыя прылады ў дзяржаўных руках (Сянкевіч, Карвоўскі, Шымкевіч, Дзякевіч). У іх касцёлах народ не мае нічога ні для сэрца, ні для розуму. Касцёлы брудныя, казанні ніжэй крытыкі, хораў, гэтага магутнага сродку прыцягнення народа да касцёла, няма, арганы лямантуюць аб божай помсце, касцельныя служкі жывуць у п'янстве і распусце, а ксяндзы — рэнегаты ці сібарыты — збіраюць грошы*». — цыт. па: Bolcewicz Henryk. Stosunki kościelne na Litwie: listy otwarte księdza do księży. S. 65.

[8] Лідскі спраўнік Сцяпан Мацвеевіч Ляўданскі. За сваю службу атрымаў розныя адзнакі і быў узнагароджаны ордэнам Уладзіміра 3-й ступені.

гэтым страшыў, што ў адваротным выпадку я буду мець цяжкія наступствы. У канцы падабрэў і ласкава прапанаваў мне быць паслухмяным, бо, пэўна, я ёсць *«лепш выхаваным»* ксяндзом, чым мой папярэднік, г. зн. — менш «фанатычным». Пры гэтым не забыўся нагадаць мне, што *«рука руку мые»*, што кожны вікарый павінен плаціць яму па сто рублёў штогод за яго працу па абароне вікарыя перад губернатарам.

Пасля спраўніка прыйшла чарга папа (Каяловіча — *Л. Л.*). Гэты мне прама сказаў, што трэба падпарадкоўвацца ўладам і быць вольным ад усялякага «фанатызму»:

— Тутэйшыя людзі спяць, — сказаў ён. — Няхай спяць, і не трэба іх будзіць!

Афіцэр жандармерыі прыняў мяне з вялікай пачцівасцю і засведчыў, што мне ў Лідзе будзе добра, калі я буду «ўмець жыць».

* * *

Такімі былі мае першыя крокі на гэтай пасадзе.

Прадставіўшыся ўладам, я змог пачаць працаваць з людзьмі. Слухаючы споведзі, менавіта тут першы раз пачуў *беларускую мову* (курсіў мой — *Л. Л.*), якую да гэтага часу цалкам не ведаў. Мне яна падалася дзіўна сумнай, але беларускі народ спадабаўся мне сваёй незвычайнай пачцівасцю. Ён на дзіва шчыры і ўдзячны, калі ставішся да яго з добрым сэрцам і прыхільнасцю[1].

Адразу зразумеў, што старыя і малыя цалкам не ведаюць пацераў. Пра катэхізіс, відавочна, не было нават і мовы.

Паколькі я не меў права навучаць народ з амбона, пачаў штонядзелю і на святы катэхізаваць людзей з алтара, а таксама кожны раз, калі мяне выклікалі да хворага. З цяжкасцю сабраў 600 дзяцей. Пасля двухмесячнай навукі,

---

[1] Успаміны пісаліся ў той час, калі кс. Бародзіч не быў яшчэ «беларусажэрцам» і таму цалкам аб'ектыўна пісаў пра лідзян, як пра беларусаў.

адбылася першая, самая вялікая да гэтага часу ў Лідзе ўрачыстасць першай св. камуніі.

* * *

У той час адбыўся інцыдэнт, які напужаў увесь горад. З касцёла знік партрэт маскоўскага князя Аляксандра Неўскага, «святога», непрызнанага Рымам, які быў размешчаны ўнутры касцёла ў часы Мураўёва (увесь сказ перакладзены гэтак, як у аўтарскім тэксце — *Л. Л.*). Пачалося следства. Нікога не знайшлі, але падазрэнне скіравалася на мяне, і жыццё маё адразу пагоршылася, нават нягледзячы на тое, што даў спраўніку «ў лапу» 19 рублёў, каб супакоіўся[1].

Тады ж закончылася пераробка кляштара ў расійскі клуб[2]. На яго адкрыццё арганізавалі вечарыну з танцамі і запрасілі гасцей, між іншых і ксяндза-дэкана разам са мной. Усімі спосабамі я спрабаваў адмовіцца ад удзелу ў гэтай урачыстасці, але ксёндз-дэкан загадаў ісці разам з ім. У апошнюю хвіліну я змог уцячы ў касцёл і там схавацца. Ксяндзу-дэкану давялося ісці аднаму і глядзець на гульні расійскай моладзі ў месцы, дзе раней маліліся манахі. Маё ж становішча яшчэ больш пагоршылася.

* * *

Уплыў папоў на каталіцкае насельніцтва не застаўся без згубных вынікаў: у самім горадзе давала аб сябе знаць рэлігійная абыякавасць. З-за вайсковай службы, а таксама царкоўных школ, моладзь размаўляла па-руску, .... Такім чынам вёска і сяляне страчвалі сваю рэлігійную самасвядомасць.

Зразумела, што горшыя ўзоры паводзін духоўнай і свецкай улады знаходзілі сваіх руплівых паслядоўнікаў.

---

[1] У сваіх успамінах, надрукаваных у 1928 г., кс. Randzіч піша, што менавіта ён сам асабіста спаліў абраз Аляксандра Неўскага. — Гл: X. kan. J. Borodzicz. Kresy Wileńskie w niebezpieczenstwie. Wilno, 1928. S. 6.

[2] Маецца на ўвазе кляштар кармелітаў..

У нашым народзе шырылася п'янства, распуста, людзі пачалі верыць ва ўсялякія забабоны, множылася звадніцтва, а крадзёж стаў звычайнай справай. Дайшло да таго, што большая частка парафіянаў не наведвала касцёл і не прыступала да Святых сакрамантаў[1].

Што мне было з гэтым рабіць? Як ратаваць загубленыя душы? Як дагрукацца да іх?

Самай лепшай нагодай для працы з людзьмі сталася для мяне каляда[2]. Пачаў аб'язджаць парафію і наведваць вёску за вёскай, хадзіць ад дома да дома. Трымаўся наступнага плану: прыехаўшы ў вёску першы раз (а вёскі былі вельмі вялікімі), ішоў ад хаты да хаты і на пачатку свянціў хату, а потым кожнага экзаменаваў на веданне катэхізіса. Пасля чаго аглядаў падарункі папоў і заканч-

---

[1] Прыкладна ў той жа час ксёндз Генрык Бальцэвіч з Жырмун пісаў: *«Пабожнасць нашага люду я назваў бы паганскім хрысціянствам. Рэлігійныя абрады выконваюцца досыць скрупулёзна, а ў жыцці — паганскі дух. Народ ходзіць у касцёл, спавядаецца, штодзённа адмаўляе пацеры, цалкам адбывае пасты і адначасова поўны ўзаемнае незычлівасці, цешыцца з чужога гора, не шануе чужой уласнасці, падпаламі сее нянавісць паміж суседзяў, сваркамі і праклёнамі робіць пекла з сваёй сям'і. Наш звычайны селянін будзе засмучаны з-за страты ружанца ці з таго, што сплюне пасля камуніі, але без усялякага сумнення ўлезе на чужы луг, ніву, лес, абкрадзе брата, будзе за рубель ці кілішак фальшыва сведчыць у судзе, грошы, пазычаныя без сведак, не верне, будзе крыўдзіць удаву і сірот, і пры тым ніхто не абароніць слабых, бо прызвычаіўся да пакутаў бліжняга і шануе толькі сілу. Адзін селянін скраў кавалак сала, але гэта была пятніца і таму не еў гэтае сала ні ў той дзень, калі скраў, ні ў наступны і толькі ў нядзелю пачаў есці тое, што скраў. Іншага злапалі, калі пасвіў быдла на чужой ніве, ён пры гэтым меў ружанец і маліўся»*. — Цыт. па: Bolcewicz Henryk. Stosunki kościelne na Litwie: listy otwarte księdza do księży. S. 68. — *Л. Л.*

[2] Аднак кс. Бальцэвіч адзначаў, што *«„візіта парафільяная“, ці так званая ў нас „каляда“, ці ж не ператварылася яна ў нас у напаўненне капланскіх торбаў і кішэняў?»* — Цыт. па: Bolcewicz Henryk. Stosunki kościelne na Litwie: listy otwarte księdza do księży. S. 79. — *Л. Л.*

ваў запрашэннем сабрацца ўсім у зручным месцы. Тут, узяўшы іх усіх у свае рукі, прыкладаў усе сілы, каб разбудзіць іх сумленне, накіраваць да святой веры і растлумачыць, якімі шкоднымі для іх з'яўляюцца царкоўныя школы. Заўсёды рабіў націск на тое, каб прыбралі розныя праваслаўныя медальёны, іконы і замест іх сам раздаваў сялянам абразы. Патрабаваў, каб пільна хадзілі ў касцёл.

Гэтак аб'ехаў усю парафію. Але як толькі закончыў гэтую справу, на мяне ўжо гатова была скарга .... Пачаліся «справки», следства і допыты.

Мне пагражала вязніца. Каб ўратаваць мяне, біскуп раней выраку ўладаў перавёў мяне вікарыем у Трокі.

Перад выездам з Ліды, у дзень Трох Каралёў, развітаўся з гасцінным беларускім людам[1]. Весткі пра мой перавод вернікі сустракалі енкам і плачам. Усе хацелі, каб я не спяшаўся з ад'ездам. Відавочна, я не мог ім гэта абяцаць, бо справа ад мяне не залежала. Тады вернікі атачылі мяне ў плябаніі і сказалі, што нікуды мяне не адпусцяць, покуль з Вільні не вернецца лідская дэлегацыя да біскупа, якую яны выслалі, каб ратаваць мяне.

Тады ж у плябанію прыйшоў спраўнік і жартам звярнуўся да мяне з вершам:

*За Лидские пороки, едете в Троки*
*А с Трок — прямо в острог.*

Потым выдаў мне білет на вольны праезд па Мінскай губерні і загадаў, каб я паціху выйшаў праз заднія дзверы плябаніі і гародамі ішоў на вакзал. На вакзале мне была выдадзена інструкцыя пра тое, што мне трэба хавацца ад парафіян і таму я паеду кружной дарогай ў напрамку Менска — на станцыю Нёман[2]. Там я дачакаюся цягніка ў бок

---

[1] Цікава, але ў 1920-я, кс. Бародзіч ужо б ніколі не назваў лідскіх рымакатолікаў беларусамі. — *Л. Л.*

Вільні і гэтак даеду да біскупа. У Нёмане прайшлося чакаць усю ноч.

[2] У той час праз Ліду яшчэ не прайшла Полацк — Сядлецкая чыгунка, і ў Мінск трэба было ехаць праз Баранавічы. — *Л. Л.*

Пачаткі . . . 3
Мураваны фарны касцёл . . . 10
Старажытныя рыма-каталіцкія могілкі каля касцёла 43
Дэканка . . . 45
Дататкі . . . 50
Спіс Лідскіх пробашчаў . . . 50
Стары дакумент фарнага касцёла . . . 51
Францішак Смуглевіч . . . 55
Фрагмент успамінаў Івана Любарскага . . . 59
Фрагмент з інвентарнага вопіса Лідскага рымска-каталіцкага касцёла і бенефіцыі ад 29 траўня 1882 года . . . 63
Пад возам і на возе (фрагмент з успамінаў ксяндза Юзафа Бародзіча) . . . 66

**Леанід Лаўрэш**

Фарны касцёл у Лідзе

Создано в интеллектуальной издательской системе Ridero

Кароткая гісторыя рыма-каталіцкага веравызнання ў горадзе Ліда (Беларусь) і фарнага касцёла. Асобы, падзеі, архітэктура, мастацтва.

ISBN 978-5-0069-3035-3
9 785006 930353 >

Rideró

Rideró.ru — издай книгу бесплатно!